Всесоюзная библиотека имени В. И. Ленина

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 112 (5786) | 17 мая 1937 г., панядзелак | ЦАНА 10 КАП.

Аб вызваленні ад уплаты грашовых падаткаў і зборау калгаснікаў і аднаасобнікаў, непрацаздольных з прычыны старога ўзросту

Пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)

Вызваліць поўнасцю з 1 ліпеня 1937 года ад уплаты грашовых падаткаў і збораў гаспадаркі калгаснікаў і аднаасобнікаў, непрацаздольных з прычыны старога ўзросту (60 год і больш) і не маючых у сям'і працаздольных членаў. Народнаму камісарыяту фінансаў Саюза ССР даручаецца ўстанавіць парадак прадастаўлення гэтай ільготы.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ

Сакратар Цэнтральнага Камітэта ВКП(б)
І. СТАЛІН

АЖЫЦЦЯВІЦЬ ПАВАРОТ У РАБОЦЕ ПРОФСАЮЗАУ

Учора кончыўся VI пленум ВЦСПС. Значэнне гэтага пленума велізарна: ён пройдзе ў гісторыю совецкага профруху, як сур'ёзнейшая, пераломная веха.

Совецкія прафесіянальныя саюзы ядноць 22 мільёны рабочых, служачых і спецыялістаў. Роля профсаюзаў у краіне сацыялізма вызначаецца, аднак, не толькі вялікай колькасцю працоўных, якія знаходзяць у гэтыя арганізацыі. Профсаюзы — масавая арганізацыя кіруючага, пануючага класа, класа — гегемона пролетарскай рэволюцыі. Умацаванне дыктатуры рабочага класа і, у прыватнасці, паспяховае правядзенне прадстаячых выбараў у советы немагчыма без актыўнага ўдзелу прафесіянальных саюзаў.

Паварот у палітычным жыцці краіны патрабуе прафесіянальныя саюзы непадрыхтаванымі. Змест і метады работы і нават сам статут гэтых арганізацый не адпавядаюць новай абстаноўцы. Кіруючыя прафсаюзныя органы не зусім уяснілі сапраўдны характар новых задач, якія пастаўлены партыяй. Яны адсталі ад шырокага размаху социялістычнага будаўніцтва, адарваліся ад мас, культурны ўзровень і палітычная актыўнасць якіх нязмерна вырасла. У гэтым, уласна кажучы, і заключаецца сутнасць своеасаблівага крызісу, які перажываюць профсаюзы.

Большасць прамоўцаў на пленуме ВЦСПС вымушана была прызнаць, што ў той ці другой профсаюзнай рабоце, адрыў кіруючых работнікаў, аж да сакратароў ВЦСПС, ад членаў прафсаюзаў тлумачацца перш за ўсё адсутнасцю ў профсаюзах сапраўднай дэмакратыі. Профсаюзы пародзе сваёй—сугуба дэмакратычныя арганізацыі. Іх дзейнасць павінна будавацца на ўмелым выкарыстанні самадзейнасці, ініцыятывы, творчасці мас. Каманданне, адміністраванне, назначэнства, кацапства выхалашчваюць грамадскі характар профсаюзаў, адрываюць прафорганы ад мас і ператвараюць іх у канцылярскія ўстановы, а прафработнікаў—у дробных начальнікаў гэтых канцылярый. Між тым, у рабоце профсаюзных органаў, пануючы ад фабрычна-заводскіх камітэтаў і канчаючы прэзідыумам ВЦСПС, дэмакратыя парушалася. Элементарныя, сталася-б, рэчы, як рэгулярнае скліканне агульных сходаў членаў прафесіянальных арганізацый, справаздачнасць перад імі, выкананне рашэнняў сходаў і канферэнцый былі ў загоне. Б'ючая крыніца актыўнасць працоўных, самадзейнасць членаў прафесіянальных саюзаў не выстоўваліся.

Перабудову профсаюзнай работы павінна пачынаць з аднаўлення дэмакратыі. Выбары прафорганаў будуць зараз праводзіцца тайным галасаваннем. Гэта прадпрыемства выявіць сапраўдныя адносіны членаў профсаюзаў да прафработнікаў, яно будзе спрыяць ачышчэнню кіраўніцтва прафесіянальных саюзаў ад бюракратаў, чыноўнікаў, людзей, якія адарваліся ад мас; яно дапаможа выявіць ворагаў народу, якія ў некаторых прафорганах пазбраліся.

Ужо на самым пленуме ВЦСПС зроблены першы крок да абнаўлення кіраўніцтва цэнтральнымі профсаюзамі: выбран новы склад прэзідыума і сакратарыята ВЦСПС. Як вядома, значная частка кіруючых профсаюзных работнікаў, якія аказаліся не на вышыні становішча, у склад прэзідыума і сакратарыята не ўвайшлі, пленум ВЦСПС і кандыдатуры адвёў, забалатываў. Наглядны ўрок усім профсаюзным работнікам, як патрэбна ажыццяўляць дэмакратыю! Няправільна думаць, што поўнае ажыццяўленне профсаюзнай дэмакратыі перашкаджае адным толькі тайным галасаваннем. Сапраўдная дэмакратыя азначае такія адносіны паміж радавымі членамі профсаюза і прафорганам, пры якіх кожнага працоўнага быў-бы ясна ўцён, да яго прыслухоўваліся-б, з ім ліліся-б.

Усім профсаюзным работнікам парадзіць, што сапраўднымі гаспадарамі арганізацыі, якую яны ў той ці іншы перыяд часу ўзначальваюць, з'яўляюцца члены прафесіянальнага саюза. Яны, і толькі яны, вырашаюць усе справы. Іх дзеля'м моцны той ці іншы прафработнік, і ім грунтуецца яго асабісты аўтарытэт.

Профсаюзы заклікаць адыграць велізарную ролю ў разгортванні совецкай дэмакратыі. Яны з'яўляюцца адною з тых грамадскіх арганізацый краіны, прычым найбольш буйнай і вядучай, якой Сталінская Канстытуцыя прадаставіла права на прадстаячых выбарах у советы высоўваць сваіх кандыдатаў. Але для таго, каб заняць належнае месца ў выбарах советаў дэпутатаў працоўных, профсаюзы абавязаны спачатку навесці парадак у сваім уласным доме і перш за ўсё раз і назаўсёды пакончыць з парушэннямі ўнутрысаюзнай дэмакратыі.

Партыя Леніна—Сталіна ператварыла прафесіянальныя саюзы ў многамільённую арганізацыю рабочага класа. Ленін надаваў велізарнае значэнне прафесіянальным саюзам, як гістарычна зусім неабходным арганізацыям рабочага класа, без якіх пролетарыят не мог-бы згуртавацца і арганізавацца як клас, паспяхова весці барацьбу супроць буржуазіі, скінуць яе панаванне, а потым пасля ўзяцця ўлады ажыццявіць сваю дыктатуру і пабудаваць социялістычнае грамадства.

Пры дапамозе большэвіцкай партыі прафесіянальныя арганізацыі ачысцілі свае рады ад меншавікоў, сіндыкалісцкіх і трэд'юніяністскіх элементаў. Паспяхова быў разгромлен правы апартунізм, трэд'юніянізм у совецкім профруху (група Томскага). Выгнаўшы з прафесіянальных саюзаў растаўратараў капіталізма — Томскага і яго бліжэйшых прыспешнікаў, многія профсаюзныя работнікі парашылі, што можна апачыць на лаўрах, у той час, як астаткі трэд'юніянізма ў практычнай дзейнасці профсаюзаў захаваліся. Астаткі трэд'юніянізма ў практычнай дзейнасці профсаюзаў прывялі да палітычнай пасіўнасці, да адмаўлення па сутнасці справы ад барацьбы з бюракратычнымі скажэннямі ў рабоце гаспадарчых і профсаюзных органаў, да ўмаленне ролі профсаюзаў, як школы комунізма.

Палітычная пасіўнасць і бесклапотнасць прывялі да таго, што профсаюзныя работнікі не змаглі ўскрыць шкоднікаў у ахове працы, социяльным страхаванні, шкоднікаў, якія зрывалі стаханаўскі рух. У профсаюзныя органы, аж да ЦК саюзаў і апарата ВЦСПС, пралезлі ворагі народу — трацкісты і правыя шкоднікі, дыверсанты. Сігналы рабочых, служачых, спецыялістаў часта аставаліся без увагі з боку профсаюзаў, што палегчыла злачынную дзейнасць ворагаў народу — трацкісцкіх шкоднікаў, дыверсантаў і іх правых саўдзельнікаў. Сярод членаў ВЦСПС аказалася некалькі трацкістаў і правых, заклятых ворагаў рабочага класа, якія толькі на пленуме, які ўчора скончыўся, выключаны са складу штаба совецкага профруху.

Прафесіянальныя саюзы ў сваіх радах яднаюць выдатны па актыўнасці і творчасці рабочы клас, шырокія колы совецкай інтэлігенцыі, найбольш палітычна кваліфікаваную і культурную частку насельніцтва. Паўсямесна ў кожнай рэспубліцы, краі, вобласці—пераважная большасць членаў прафесіянальных саюзаў, як вядома, жыве ў гарадах і рабочых пасёлках. Стала быць, калі мы хочам узмацніць кіруючую ролю горада, як цэнтра палітычнага, гаспадарчага і культурнага жыцця, неабходна ўсямерна ўзняць да ўзроўню сённешніх задач тую арганізацыю, якая ахапляе, яднае працоўных гарадоў—прафесіянальны саюз. Інакш усякія размовы аб умацаванні кіруючай ролі горада будуць толькі бясплоднай балбатнёй.

Шкодныміі, нічога агульнага з ленінізмам не маючымі, з'яўляюцца пагардлівыя адносіны некаторых комуністаў да профсаюзнай работы. Зараз профсаюзы вельмі адстаюць ад патрабавання партыі, ад запросаў працоўных. Узняць работу прафесіянальных саюзаў комуністы могуць, толькі апіраючыся і ўцягваючы ў актыўную профсаюзную работу мільёны беспартыйных рабочых і служачых. Комуністы — важакі і кіраўнікі прафесіянальных саюзаў. Кожны комуніст — адказны ўдзельнік профсаюзнай работы. На пленуме ВЦСПС прысутнічалі сакратары ЦК ВКП(б) таварышы Л. М. Каганавіч, А. А. Андрэеў. Іх удзел унёс у работу пленума сталінскі дух, большэвіцкую палкасць, бескампромісную крытыку,—усё тое, што неабходна, у чым маюць патрэбу нашы прафсаюзы.

Пленум ВЦСПС кончыўся. Ён вынес выключна важныя рашэнні, якія ўказваюць совецкім профсаюзам правільны шлях. Зараз справа за тым, каб рашэнні пленума ВЦСПС давесці да кожнай профсаюзнай ячэйкі, растлумачыць кожнаму члену профсаюза, правесці ў жыццё. У гэтым—галоўнае!

„Правда“.

АБ СПРАВАЗДАЧАХ ПРОФСАЮЗНЫХ ОРГАНАУ У СУВЯЗІ З ВЫБАРАМІ АПОШНІХ

Рэзалюцыя VI пленума ВЦСПС па дакладу тав. ШВЕРНІКА

Налыходзячыя справаздачы і выбары профсаюзных органаў будуць праходзіць ва ўмовах паваротy ў палітычным жыцці краіны і ўзмацнення палітычнай актыўнасці мас на аснове новай Канстытуцыі. Цяпер яшчэ больш ўзрастае роля прафесіянальных саюзаў у справе развіцця социялістычнай дэмакратыі і ўмацавання дзяржаўнага кіраўніцтва грамадствам (дыктатуры) рабочага класа.

Для таго, каб профсаюзы маглі паспяхова выконваць свае задачы ва ўмовах социялістычнага грамадства і разгорнутай ссцыялістычнай дэмакратыі, яны павінны перш за ўсё знішчыць скажэнні і недахопы ў сваёй рабоце, паслядоўна праводзіць у сваіх арганізацыях зверху данізу прынцыпы сапраўднага дэмакратызма.

Тым часам, кіруючыя профсаюзныя органы, не зусім уяснёўшы сабе характар новай абстаноўкі і сваіх новых задач, адсталі ад шырокага размаху социялістычнага будаўніцтва і адарваліся ад профсаюзных мас, культурны ўзровень і палітычная актыўнасць якіх нязмерна вырасла.

У гэтым адставанні ад социялістычнага будаўніцтва і адрыве профсаюзных кіруючых органаў ад профсаюзнай масы заключаецца сутнасць своеасаблівага крызісу профсаюзаў.

Яшчэ два гады таму назад ЦК ВКП(б) паставіў з усёй астрэтай пытанне аб неабходнасці сур'ёзнага і крутога павароту ў бок шырокай дэмакратыі ва ўсёй рабоце совецкіх профсаюзаў ад ВЦСПС да фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў. Гэтыя ўказанні ЦК ВКП(б) не былі выкананы ВЦСПС і ЦК саюзаў.

Важнейшая і неабходная справа разбуйнення профсаюзаў і перанясення цэнтра цяжару работы на вытворчыя саюзы і іх ЦК ажыццёўлена ВЦСПС і ЦК саюзаў фармальна і не суправаджалася перабудовай профсаюзнай работы і ўмацаваннем сувязі кіруючых профсаюзных органаў з членамі профсаюзаў. Не гледзячы на тое, што з часу разбуйнення профсаюзаў прайшло два з паловай гады, з'езды па новаарганізаваных саюзах не былі да гэтага часу скліканы, а большасць ЦК саюзаў асталіся не пераабранымі.

Кіруючыя работнікі профсаюзаў не толькі не ўзмацнілі сваёй работы па задавальненню культурна-бытавых запатрабаванняў рабочых і служачых, але прышлі ў замяшанне перад узрослымі культурнымі запатрабаваннямі членаў саюзаў, страцілі густ да масавай работы, да абслугоўвання культурна-бытавых патрэб рабочых і служачых.

Кіруючыя работнікі профсаюзаў не зразумелі таго, што клопаты аб задавальненні культурна-бытавых запатрабаванняў членаў саюзаў, аб паляпшэнні культурна-масавай работы з'яўляюцца важнейшай справай прафесіянальных саюзаў ва ўмовах совецкага ладу. Замест таго, каб уважліва і па-дзелавому заняцца пытаннямі паляпшэння культурна-бытавога абслугоўвання рабочых (сталовыя, жыллёвыя памяшканні, бальніцы, клубы, дамы адпачынку, дзіцячыя сады, яслі і інш.), кіруючыя работнікі вельмі часта адмахваюцца ад гэтых пытанняў, ці абмяжоўваюцца фармальна канцылярскай адпіскай.

Паспяхова разбіўшы контрэволюцыйны трэд-юніянізм у профруху (Томскі і яго група) з яго тэорыяй і практыкай процідпастаўлення профсаюзаў совецкай дзяржаве, многія профсаюзныя работнікі рашылі, што пасля гэтага можна спачыць на лаўрах, не клапоцячыся аб тым, каб давесці да канца выкрыццё астаткаў трэд-юніянізма штодзённай практычнай работай профсаюзаў.

Гэтыя астаткі трэд-юніянізма ва многіх, нават у новых работнікаў профсаюзаў, выразіліся ў палітычнай пасіўнасці, у роўнадушных адносінах да бюракратычных скажэнняў у рабоце гаспадарчых і профсаюзных органаў па задавальненню культурна-бытавых патрэб рабочых і служачых, у адыходзе ад вылучэння кадраў для органаў дзяржавы, ва ўмаленні задач профсаюзаў, як школы комунізма. Іменна гэтым тлумачыцца, што профсаюзныя работнікі не змаглі ўскрыць шкоднікаў у ахове працы, у социяльным страхаванні, шкоднікаў, зрываўшых стаханаўскі рух, ускрыць шкоднікаў работу ў снабжэнні рабочых, у жыллёвым будаўніцтве.

У профсаюзныя органы аж да ЦК саюзаў і апарата ВЦСПС пранікілі і дзейнічалі ворагі народу — трацкісты і правыя, шкоднікі і дыверсанты: загадчык бюро социяльнага страхавання ВЦСПС — Котаў, загадчык замежнага бюро ВЦСПС — Жарыкаў, старшыня ЦК саюза рабочых кокса-хімічнай прамысловасці — Гільбург, старшыня ЦК саюза работнікаў пачатковай і сярэдняй школы РСФСР — Калаціла́ў, сакратар ЦК саюза рабочых нафтаперагоннай прамысловасці — Каюраў, член прэзідыума ЦК саюза рабочых нафтапромыслаў Каўказа — Чыслоў.

У выкрыцці шкоднікаў і ворагаў рабочага класа ў профсаюзным апараце кіруючыя профсаюзныя работнікі праявілі недапушчальную палітычную слепату, марудзнасць і бесклапотнасць. Многія профсаюзныя работнікі лічылі пры гэтым, што барацьба са шкоднікамі, з ворагамі рабочага класа — гэта не іх справа, а справа іншых органаў. Яны забыліся аб тым, што партыя неаднаразова патрабавала ад профсаюзаў барацьбы з бюракратычнымі скажэннямі ў совецкіх і гаспадарчых органах, а тым больш — барацьбы са шкоднікам у справе культурна-бытавога абслугоўвання рабочых.

Кіраўнікі профсаюзаў павінны памятаць, што профсаюзы — гэта многамільённая масавая арганізацыя, якая мае свае асобыя задачы, асобыя метады сваёй работы, што яны павінны быць да канца дэмакратычнай арганізацыяй — школай комунізма.

Між тым, у рабоце профсаюзных органаў ад фабрычна-заводскіх камітэтаў да прэзідыума ВЦСПС вельмі часта парушаюцца прынцыпы профсаюзнай дэмакратыі. Парушана сістэма выбарнасці профорганаў: фабрычна-заводскія і мясцовыя камітэты, абласныя і цэнтральныя камітэты не перавыбіраліся па 3—5 год. У профсаюзах укаранілася сістэма кааптацыі.

На маскоўскім заводзе «Дынамо» імя Кірава з ліпеня 1935 года змянілася без выбараў 4 старшыні заўкома. На Краснаўральскім медзеплавільным заводзе за два гады змянілася шляхам кааптацыі 6 старшынь заўкомаў. Старшыні заўкомаў прыходзілі без выбараў і ўходзілі, не адчытваючыся аб сваёй рабоце. Пленум ВЦСПС не збіраўся два з паловай гады. У цэнтральных камітэтах многіх профсаюзаў прэзідыумы фактычна не існуюць — старшыні і сакратары аднаасобна вырашаюць усе пытанні.

Профсаюзныя органы фактычна ліквідавалі сістэматычную справаздачнасць прафорганаў перад членамі профсаюзаў. Агульныя сходы членаў профсаюзаў склікаюцца вельмі рэдка, дрэнна падрыхтоўваюцца, носяць пераважна не дзелавы, а фармальна-дэкларатыўны характар. Рашэнні сходаў зачастую не праводзяцца ў жыццё, выкананне іх не правяраецца.

У рэзультаце ўмалення прынцыпаў справаздачнасці і выбарнасці профработнікі паставілі сябе ў незалежнае становішча ад членскай масы. Адсюль няўвага профработнікаў да задавальнення ўзрастаючых запатрабаванняў членаў саюза, нячулы адносіны да скарг і прапаноў рабочых і служачых, адсутнасць крытыкі і самакрытыкі.

Замест шырокага скарыстання ініцыятывы і самадзейнасці членаў профсаюзаў, стварэння выбарнага і добраахвотніцкага актыва, работа профсаюзаў знізу даверху пабудавана, галоўным чынам, на платным апараце, на платных работніках. Многія профсаюзныя кіраўнікі не хочуць зразумець, што яны маюць невычарпальныя рэзервуары кадраў, што пры актыўнасці рабочага класа можна было вылучыць сотні тысяч выдатных работнікаў. Аднак, у рэзультаце звужэння дэмакратыі, у рэзультаце скарачэння выбарнасці звузіўся круг людзей, якія працуюць у профсаюзных органах, штучна затрудніласа вырошчванне і вылучэнне новых людзей. Больш таго, работнікі падбіраліся ў прафорганы вельмі часта не па палітычных і дзелавых якасцях, а па прынцыпу «асабістых сувязей», «зручнасці», «спрацаванасці», «прыяцельскіх адносін».

Буйныя недахопы ёсць у рабоце профсаюзаў па социяльнаму страхаванню. Перадача профсаюзам справы социяльнага страхавання павінна была суправаджацца карэннай яе перабудовай на аснове прыцягнення саміх членаў саюза да распараджэння велізарнымі сродкамі социяльнага страхавання. Між тым, справа социяльнага страхавання вядзецца бюракратычнымі, ведамственымі метадамі, а члены профсаюзаў не прыцягваюцца да гэтай работы, кантроль членаў саюза над размеркаваннем і скарыстаннем сродкаў социяльнага страхавання адсутнічае. Гэта дало магчымасць усякага роду жулікам, пракадзімцам і ворагам народу пранікнуць у апарат соцстраха, няправільна скарыстоўваць, разбазарваць і раскрадаць мільёны рублёў дзяржаўных сродкаў: бюро социяльнага страхавання ВЦСПС, украінскі, ленінградскі, беларускі советы профсаюзаў.

Профсаюзы не вядуць сапраўднай барацьбы за паляпшэнне лекавай дапамогі, за лепшую пастаноўку санаторыяў, дамоў адпачынку, бальніц, асабліва для цяжка хворых. У рабоце органаў социяльнага страхавання адсутнічае ўважлівы індывідуальны падыход да хворых, у асабліваці да маючых патрэбу ў сур'ёзным лячэнні.

Профсаюзныя арганізацыі, атрымаўшы ад дзяржавы такі магутны рычаг паляпшэння ўмоў працы рабочых, як работа па ахове працы і тэхніцы безапаснасці, не здолелі яе арганізаваць і не стварылі сапраўднага кантролю шырокіх мас над выкананнем совецкага прапоўнага заканадаўства. Неаднаразовыя сігналы рабочых, служачых, інжынераў і тэхнікаў аб наяўнасці злачынага парушэння працоўнага заканадаўства, правіл тэхнікі безапаснасці (разбурэння вентыляцыйных установак, агароджанняў і т. п.) зачастую аставаліся без увагі з боку профсаюзаў (ЦК саюза рабочых злабычы каляровых металаў, ЦК саюза рабочых сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва, ЦК саюза рабочых каменавугальнай прамысловасці Данбаса і інш.). Кіраўнікі профсаюзаў не праявілі да гэтых сігналаў рабочых палітычнага чуцця, не зрабілі з іх палітычных і практычных вывадаў, не змагаліся супроць злачыннага парушэння законаў аб ахове працы, чым аблягчылі магчымасць для злачыннай дзейнасці ворагаў народу — трацкісцкіх шкоднікаў, дыверсантаў і іх правых саўдзельнікаў.

Профсаюзы вельмі аслабілі масава-вытворчую работу, не кіравалі социялістычным спаборніцтвам і стаханаўскім рухам, асабліва ў першую стадыю яго развіцця. Многія профсаюзныя органы самаўхіліліся ад кіраўніцтва вытворчымі нарадамі. А між тым выхаванне комуністычных адносін да працы і барацьба за павышэнне прадукцыйнасці працы з'яўляюцца адной з асноўных задач профсаюзаў.

Прэзідыум ВЦСПС працаваў канцылярска-бюракратычнымі метадамі, сістэматычна спазняўся з вырашэннем важнейшых пытанняў прафесіянальнага руху. Рашэнні прэзідыума зачастую насілі характар агульных дэкларацый, праверкі выканання не было. Кіраўнікі ВЦСПС не праявілі ініцыятывы ў рабоце, не было большэвіцкай настойлівасці ў давядзенні да канца пачатай справы. Прэзідыум ВЦСПС не ажыццяўляў канкрэтнага, штодзённага кіраўніцтва ЦК профсаюзаў. Прэзідыум ВЦСПС не прыцягнуў да работы, не скарыстаў для сувязі з рабочымі масамі членаў ВЦСПС, якія працуюць на прадпрыемствах. У ВЦСПС не арганізаван прыём наведвальнікаў, няма бюро скаргаў.

Большасць цэнтральных камітэтаў профсаюзаў не ведаюць становішча на прадпрыемствах, не ведаюць і не вывучаюць, чым жывуць і якія пытанні высоўваюць члены саюзаў, не падхватваюць і не абмяркоўваюць гэтых пытанняў. Цэнтральныя камітэты не кіруюць фабрычна-заводскімі і мясцовымі камітэтамі, не крытыкуюць іх і не выпраўляюць іх памылак. З прычыны гэтага ў рабоце раду цэнтральных і абласных камітэтаў ёсць бюракратычныя скажэнні, безгаспадарчасць, парушэнне фінансавай дысцыпліны і няправільнае расходванне дзяржаўных і профсаюзных сродкаў (ЦК саюза рабочых кансервавай прамысловасці, ЦК саюза рабочых бавоўна-соўгасаў і МТС, ЦК саюза рабочых чорнай металургіі Поўдня, ЦК саюза рабочых гарадскіх прадпрыемстваў, ЦК саюза работнікаў палітасветустаноў).

Газета «Труд», орган ВЦСПС, і газеты цэнтральных камітэтаў саюзаў не лабіліся яшчэ неабходнай астраты ў крытыцы недахопаў профсаюзных арганізацый і канкрэтных носьбітаў гэтых недахопаў. Газеты слаба асвятляюць рабочае жыццё. У «Труде» не прымаюць удзелу кіруючыя профсаюзныя работнікі, а тым больш радавыя члены саюзаў, мала асвятляецца вопыт профсаюзнай работы.

Журналы, выдаваемыя профсаюзамі, не вядуць работу з масамі і не задавальняюць запатрабаванні нізавых прафарганізацый. Профвыдат нічога не робіць для таго, каб узброіць профсаюзны актыў неабходнымі практычнымі дапаможнікамі для яго работы.

Без выкрыцця ўсіх недахопаў у рабоце профсаюзаў, без упартай барацьбы з палітычнай пасіўнасцю і блізарукасцю, з коснасцю і бюракратызмам прафорганаў немагчыма выпраўленне гэтых недахопаў, правядзенне сапраўднага дэмакратызма ў профсаюзах і паварот у рабоце профсаюзаў у адпаведнасці з новымі ўмовамі і задачамі.

Кіраўнікі профсаюзаў павінны зразумець, што клопаты аб культурна-бытавых патрэбах рабочых і служачых і паляпшэнні культурна-масавай работы з'яўляюцца цяпер ва ўмовах совецкага ладу, росту актыўнасці і культурных запатрабаванняў мас важнейшай, першаступеннай справай прафесіянальных саюзаў.

У мэтах знішчэння адзначаных вышэй недахопаў у рабоце профсаюзаў і перабудовы іх работы Пленум ВЦСПС пастанаўляе:

1. Ліквідаваць практыку кааптацыі ў прафарганізацыях і аднавіць поўнасцю выбарнасць кіруючых органаў профсаюзаў.

2. Правесці ў 1937 годзе выбары ўсіх профсаюзных органаў знізу доверху на аснове крытыкі і самакрытыкі з поўным захаваннем шырокай профсаюзнай дэмакратыі.

3. Забараніць пры выбарах прафорганаў галасаванне спісам, галасаванне рабіць па асобных кандыдатурах, забяспечыўшы пры гэтым за ўсімі членамі профсаюзаў неабмежаванае права адводу кандыдатаў і крытыкі апошніх.

4. Устанавіць пры выбарах прафорганаў закрытае (тайнае) галасаванне кандыдатаў.

5. Перад выбарамі ўсе профсаюзныя органы павінны адчытацца аб сваёй дзейнасці перад членамі саюзаў. Справаздачы прафорганаў павінны суправаджацца справаздачамі рэвізійных камісій.

6. Абавязаць цэнтральныя камітэты саюзаў выдаць кароткія друкаваныя справаздачы аб сваёй рабоце і разаслаць іх нізавым прафарганізацыям.

7. Прапанаваць рэдакцыі газеты «Труд», рэдакцыям газет цэнтральных камітэтаў саюзаў і фабрычна-заводскім шматтыражкам асвятляць ход справаздач і выбараў прафсаюзных органаў.

8. Выбары профсаюзных органаў на прадпрыемствах і ва ўстановах (фабрычна-заводскія камітэты, мясцовыя камітэты, цэхавыя камітэты, групавыя прафарганізатары) правесці з 1 чэрвеня па 15 ліпеня. Абласныя канферэнцыі і ўсесаюзныя з'езды саюзаў з выбарамі кіруючых прафорганаў правесці з 15 ліпеня па 1 кастрычніка. Усесаюзны з'езд профсаюзаў СССР назначыць на 20 кастрычніка 1937 года *).

9. Устанаўліваючы, што паспяховаму выкананню рашэння пленума ВЦСПС аб павышэнні ролі вытворчых саюзаў і іх цэнтральных камітэтаў у справе лепшага абслугоўвання рабочых перашкаджалі міжсаюзныя арганізацыі (советы профсаюзаў, раённыя, гарадскія, абласныя, краявыя і рэспубліканскія), а таксама ўлічваючы, што пры разбуйненні профсаюзаў міжсаюзныя арганізацыі, адыграўшыя ў свой час станоўчую ролю, не могуць цяпер ахапіць усе бакі жыцця і дзейнасці профсаюзных арганізацый, павялічыўшайся колькасці профсаюзаў і іх членаў, скасаваць раённыя, гарадскія, абласныя, краявыя і рэспубліканскія советы профсаюзаў.

10. Для прыцягнення актыва членаў профсаюзаў да ўдзелу ў рабоце па социяльнаму страхаванню арганізаваць на прадпрыемствах і ўстановах, пры фабзаўмясцкомах советы социяльнага страхавання, усклаўшы на советы социяльнага страхавання вызначэнне размеру дапамогі па часовай непрацаздольнасці, накіраванне рабочых і служачых у санаторыі і дамы адпачынку, дзяцей рабочых і служачых — у дзіцячыя яслі, сады і піонерлагеры, арганізацыю кантролю над правільнай выдачай бюлетэняў, над пастаноўкай лекавай дапамогі.

11. Маючы на ўвазе, што асноўнай задачай прафсаюзаў у справе аховы працы з'яўляецца ажыццяўленне даручанага дзяржавай профсаюзам кантролю над выкананнем гаспадарчымі органамі законаў аб працы (тэхніка безапаснасці, рабочы час, выходныя дні, нормы спецвопраткі і спецабутку) і барацьба з бюракратычнымі скажэннямі ў гэтай галіне, абавязаць профсаюзы звярнуць сур'ёзную ўвагу на павышэнне кваліфікацыі інспектароў працы, на ўмацаванне іх складу добра падрыхтаванымі ўмовы працы данай вытворчасці работнікамі, на прыцягненне шырокага добраахвотніцкага актыва грамадскіх інспектароў перш за ўсё з ліку кваліфікаваных рабочых і служачых — стаханаўцаў.

У мэтах умацавання і ўзнімання аўтарытэту інспектароў працы ўстанавіць, што прававыя, тэхнічныя і санітарныя інспектары працы зацвярджаюцца на пленумах цэнтральных камітэтаў саюзаў, прычым інспектар можа атрымаць званне інспектара толькі пасля здачы спецыяльнага экзамена ў асобай кваліфікацыйнай камісіі, арганізуемай пры ЦК саюзаў.

12. Аднавіць практыку заключэння калектыўных дагавораў паміж профсаюзамі і гаспадарчымі органамі.

Прапанаваць цэнтральным камітэтам саюзаў сумесна з адпаведнымі гаспадарчымі органамі ўстанавіць парадак заключэння калектыўных дагавораў з тым, каб у колдагавор былі ўключаны, з улікам асаблівасцей той або іншай вытворчасці, асноўныя ўмовы працы і зарплаты, а таксама мерапрыемствы па ахове працы і тэхніцы безапаснасці.

Заключэнне калектыўных дагавораў прыўрочыць да зацверджання народнагаспадарчага плана на 1938 год.

13. Аднавіць практыку рэгулярнага склікання прафарганізацыямі вытворчых нарад, уцягваючы шырокія масы рабочых, служачых, інжынераў і тэхнікаў у справу паляпшэння вытворчасці. На буйных прадпрыемствах устанавіць практыку рэгулярнага склікання вытворчых канферэнцый.

14. Прапанаваць усім прафарганізацыям прымаць актыўны ўдзел у размеркаванні сродкаў на жыллёвае будаўніцтва, у вызначэнні месца і тыпу будаўніцтва, у размеркаванні жыллёвай плошчы, дабіваючыся пры гэтым паляпшэння становішча жыллёвых памяшканняў і іх рамонту.

Асаблівую ўвагу звярнуць на будаўніцтва і становішча дзіцячых ясляў і садоў, прыцягваючы да гэтай работы шырокі актыў рабочых і служачых і іх жонак.

15. Маючы на ўвазе, што адным з важнейшых звенняў дзейнасці профсаюзаў павінна стаць культурна-асветная работа, абавязаць профсаюзы звярнуць асаблівую ўвагу на выхаванне членаў профсаюзаў у духу социялізма, на разгортванне агульнаасветнай работы і павышэнне кваліфікацыі рабочых і служачых, арганізацыю разумнага адпачынку і забаў, разгортванне масавага турызма, загарадных экскурсій у выходныя дні, фізкультуры і спорту і мастацкай самадзейнасці.

16. Адзначаючы запушчанасць клубаў і клубнай гаспадаркі, абавязаць профсаюзныя органы аднавіць выбарнасць праўленняў клубаў і сістэматычную іх справаздачнасць перад сваімі выбаршчыкамі, прыняць меры да прывядзення ў парадак клубнай гаспадаркі, стварэння ў клубах належнай утульнасці і ўмоў для творчай самадзейнасці членаў саюза.

17. Лічачы, што справа фінансавай справаздачнасці і рэвізіі набывае асаблівае значэнне, пленум ВЦСПС асуджае безадказныя адносіны многіх кіруючых прафработнікаў да фінансавай гаспадаркі і адсутнасць фінансавай справаздачнасці перад членамі саюзаў і абавязвае прэзідыум ВЦСПС, ЦК і абкомы саюзаў і фабзаўмясцкомы ўстанавіць найстражэйшую справаздачнасць, фінансавую дысцыпліну і сурова караць за безгаспадарчыя адносіны да профсаюзных сродкаў, а за малейшую растрату аддаваць пад суд.

18. Прыдаючы асаблівае значэнне справе большэвіцкага выхавання і павышэння кваліфікацыі профсаюзных кадраў:

а) прапанаваць цэнтральным камітэтам саюзаў арганізаваць пастаянныя трохмесячныя курсы для старшынь абласных, краявых і фабрычна-заводскіх камітэтаў;

б) прэзідыуму ВЦСПС арганізаваць трохмесячныя курсы для старшынь і сакратароў цэнтральных камітэтаў саюзаў і інструктароў ЦК;

в) арганізаваць школы для падрыхтоўкі загадчыкаў клубамі.

Абавязаць прэзідыум ВЦСПС у месячны тэрмін разгледзець і зацвердзіць праграму для вышэйазначаных курсаў.

***

Пленум ВЦСПС заклікае ўсіх рабочых, служачых, інжынерна-тэхнічных і навуковых работнікаў, усіх членаў профсаюзаў прыняць актыўнейшы ўдзел у выбарах профсаюзных органаў, дапамагчы крытыкай і сваімі практычнымі прапановамі палепшыць работу прафесіянальных арганізацый і вылучыць у профсаюзныя органы лепшых, найбольш актыўных і адданых справе рабочага класа людзей.

Тістарычныя рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) (люты-сакавік 1937 г.) мабілізуюць усіх працоўных нашай радзімы і перш за ўсё 22 мільёны перадавых людзей, арганізаваных у прафесіянальныя саюзы, на развіццё крытыкі і самакрытыкі, на ліквідацыю недахопаў у рабоце профсаюзаў, на выкараненне ворагаў народу і на далейшыя поспехі справы социялізма.

Пленум ВЦСПС выражае цвёрдую ўпэўненасць у тым, што большэвіцкая крытыка і выпраўленне недахопаў работы профсаюзаў дапамогуць ім ажыццявіць паварот у сваёй рабоце, умацаваць сувязь прафесіянальных органаў з масамі і яшчэ цясней згуртаваць мільёны рабочых і служачых вакол чырвонага сцяга комунізма.

*) Пленум ВЦСПС зацвердзіў тэрміны склікання з'ездаў па асобных саюзах.

ЗАКОНЧЫЎСЯ ПЛЕНУМ ВЦСПС

Учора, 15 мая, VI пленум Усесаюзнага Цэнтральнага совета прафесіянальных саюзаў закончыў сваю работу.

Выступаўшыя аднадушна адзначалі, што прынятыя пленумам рашэнні маюць вялікае палітычнае значэнне і што ажыццяўленне іх, несумненна, створыць круты паварот у дзейнасці совецкіх профсаюзаў. Задача зараз заключаецца ў тым, каб арганізацыйна забяспечыць правядзенне гэтых рашэнняў у жыццё, пабаявому правесці справаздачы і выбары прафесіянальных органаў, дастойна сустрэць X Усесаюзны з'езд профсаюзаў.

Пленум выбраў тайным галасаваннем сакратарыят і прэзідыум ВЦСПС.

СКЛАД САКРАТАРЫЯТА І ПРЭЗІДЫУМА ВЦСПС

VI пленум ВЦСПС выбраў сакратарыят ВЦСПС у наступным складзе: 1) Швернік Н. М., 2) Нікалаева К. І., 3) Маскатаў П. Г., 4) Брэгман С. Л., 5) Егорава Е. Н.

У прэзідыум ВЦСПС выбраны тт. 1) Швернік Н. М., 2) Нікалаева К. І., 3) Маскатаў П. Г., 4) Брэгман С. Л., 5) Егорава Е. Н., 6) Лазоўскі С. А., 7) Куркіна М. Н., 8) Раманаў М. М., 9) Панаў М. П., 10) Талалай Л. Б., 11) Волкаў М. А., 12) Локшын Л. М., 13) Собаль Н. Л., 14) Вяроніна Н. В., 15) Зелік

НА ПАРТЫЙНЫХ КАНФЕРЭНЦЫЯХ

ГОМЕЛЬ

Прадаўжаюцца спрэчкі па справаздачнаму дакладу гаркома партыі. Дэлегаты дакладваюць канферэнцыі аб становішчы партыйнай работы і высоўваюць пытанні, над вырашэннем якіх павінен будзе працаваць новаабраны гарком партыі. Дэлегаты рэзка крытыкуюць работу гаркома.

— Я ішоў на канферэнцыю з думкаю пачуць у дакладзе тав. Стакуна вопыт партыйнай работы па-новаму, — гаворыць тав. Сінельнікаў, — пачуць першыя вынікі перабудовы партработы на аснове рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна.

З такой-жа думкаю ішоў кожны дэлегат. Аднак дакладчык не сказаў аб тым, што ёсць новага ў рабоце партыйнай арганізацыі. Гэта сведчыць аб тым, што гарком не займаўся справай перабудовы работы і не ведае сапраўднага становішча.

Тав. Сінельнікаў прыводзіць цэлы рад фактаў, якія характарызуюць стыль работы гаркома партыі. Нарады і сходы ў гаркоме партыі заўсёды праходзяць неарганізавана, са спазненнем і з гэтым прымірыліся кіраўнікі гаркома. Выкліканыя на пасяджэнне бюро гаркома праседжваюць у прыёмнай гаркома па 5—6 гадзін, чакаючы свайго выкліку, трацячы дарагі час. Для таго, каб узяцца на ўчот, комуністу траба дзесяткі разоў прыходзіць у гарком, бо да сакратара гаркома папасці вельмі цяжка. Апарат гаркома працуе нячотка.

— Прайшоўшы партыйны сход партыйнай арганізацыі Ўпраўлення Беларускай чыгункі ўскрыў заганы ў рабоце палітаддзела чыгункі, — гаворыць начальнік палітаддзела чыгункі Цвяткоў. — У штабе дарогі, яшчэ да гэтага часу сядзяць навыкрытыя ворагі з партыйным білетам у кішэні. У палітаддзеле чыгункі ёсць добрадушнасць і самасуднаеенасць, якія насалжаліся намеснікам начальніка тав. Шульманам.

Намеснік рэдактара газеты «Палеская праўда» тав. Фішбейн указвае на слабую сувязь газеты з партыйнай і беспартыйнай масай, што гарком партыі не аддае належнай увагі рабоце газеты. Таксама тав. Фішбейн указвае на вельмі дрэнную работу аддзела друку ЦК КП(б)Б, які не кіруе друкам, не падхапляе каштоўнай ініцыятывы, не перадае вопыту.

— Гарком партыі самаўхіліўся ад кіраўніцтва комсамолам, — гаворыць тав. Абугаў. Па прыкладу гаркома КП(б)Б первічныя партарганізацыі недаацэньваюць работу комсамольскіх арганізацый. Комсамольскіх работнікаў перакідаюць з адной работы на другую, не лічачыся з тым, што яны з'яўляюцца неабходнымі на сваёй рабоце.

Тав. Малашонак (старшыня горсовета) расказвае аб тым, якую вялікую карысць і навуку далі справаздачна-выбарчыя сходы первічных арганізацый для кіруючых работнікаў, у прыватнасці, для яго асабіста. Тав. Малашонак, крытыкуючы работу горсовета, указвае на адну з галоўных прычын гэтай дрэннай работы.

— Адказныя партыйныя работнікі, члены пленума горсовета не прымаюць ніякага канкрэтнага ўдзелу ў рабоце горсовета, калі не лічыць іх рэдкага наведвання ўрачыстых пленумаў. Многія з іх, як напрыклад тав. Панамароў (начальнік Беларускай чыгункі), нават не знайшлі часу забраць свае дэпутацкія мандаты.

З цікавай прамовай, насычанай канкрэтнымі фактамі, выступіў старшыня Дорпрофсожа Беларускай чыгункі тав. Іваноў. Ён прыводзіць факты прытуплення большэвіцкай пільнасці ў партарганізацыях чыгункі, факты грубага парушэння профсаюзнай дэмакратыі і нячуласці кіруючых работнікаў да «маленькіх людзей».

Інструктар гаркома КП(б)Б тав. Курган гаварыў аб парочнай сістэме кіраўніцтва гаркома інструктарамі гаркома партыі, у рэзультаце чаго інструктары ператварыліся ў хлопчыкаў на пабягушках.

У спрэчках па дакладу выступіла 45 чалавек. Спрэчкі прадаўжаюцца.

ЧЫКУН.

ВІЦЕБСК

ВІЦЕБСК. 16 мая прадаўжаліся спрэчкі па справаздачнаму дакладу гаркома партыі. Характэрна, што і на гэты раз выступаючыя аддаюць многа ўвагі набалеўшаму пытанню — аб дрэнным становішчы прапаганды і агітацыі. Аб гэтым гаворыць прапагандыст т. Кавалёнка, аб гэтым гаворыць і рад іншых таварышоў (Геер, Кандакоў і інш.).

Выступае загадчык культпропа гаркома партыі т. Есько. Голая фіксацыя фактаў, біццё ў грудзі, спасыланне на аб'ектыўшчыну — вось стрыжань яго выступлення. Тав. Есько прызнае, што крытыка дрэннай работы культпропа і яго асабіста — правільная, што ідэйнае выхаванне комуністаў пастаўлена зусім дрэнна. Аднак, т. Есько ні словам не абмовіўся аб тым, што-ж гаркомам партыі і культпропам практычна робіцца для наладжвання прапагандысцкай работы. А гэта-ж галоўнае, чаго чакалі дэлегаты канферэнцыі ад выступлення члена бюро гаркома партыі, які ўзначальвае ў ім адказны аддзел.

Нікога таксама не задаволіла выступленне т. Васількоўскага (начальнік палітаддзела Віцебскага аддзялення). Гаворачы аб тым, што гаспадарчыя поспехі ўскружылі галаву работнікам палітаддзела і яму асабіста, ён абсалютна ні словам не абмовіўся аб тым, як-жа палітаддзел перабудоўвае сваю масава-палітычную работу, у адпаведнасці з рашэннямі лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б). Нічога т. Васількоўскі таксама не сказаў аб тым, як партыйныя, гаспадарчыя і профсаюзныя арганізацыі, а таксама палітаддзел вядуць барацьбу па выкарчоўванню рэшткаў шкодніцтва.

З вострай крытыкай работы гаркома партыі і аддзелаў ЦК КП(б)Б выступіў т. Сазонтаў. У рабоце гаркома,—гаворыць ён, яшчэ на сучасны момант пераважае бяспланавасць, бюракратычныя метады кіраўніцтва. Гарком партыі, яго апарат, члены бюро гаркома адарваны ад первічных партарганізацый.

Аддзелы ЦК КП(б)Б таксама сваю работу вельмі марудна перабудоўваюць. У аддзелах ЦК КП(б)Б яшчэ многа «тэлеграфнага», папярова-бюракратычнага кіраўніцтва. Ускрытыя за апошні час факты гавораць за тое, што і ў ЦК КП(б)Б большэвіцкая пільнасць не заўсёды была на патрэбнай вышыні. Гэта дало магчымасць заядлым ворагам рабочага класа праводзіць сваю контррэвалюцыйную работу ў асобных наркаматах, як у Наркамземе і Наркомасветы. Аб гэтым таксама гаварыў тав. Красноў. Ён асабліва падкрэслівае недапушчальнае прытупленне пільнасці ў Саўнаркоме БССР і старшыні Саўнаркома тав. Галадзеда, які не сумеў своечасова выкрыць гэтых ворагаў народу.

Тав. Рагожкін — сакратар гаркома комсамола, у сваім выступленні спыняецца на слабым кіраўніцтве партыйных арганізацый і гаркома партыі комсамольскімі арганізацыямі.

Рад дэлегатаў даволі рэзка крытыкаваў інструктароў гаркома партыі, абвінавачвалі іх у дрэннай сувязі з первічнымі партарганізацыямі, у адсутнасці з іх боку канкрэтнай дапамогі.

Аб рабоце няштатных інструктароў гаркома партыі гаворыць парторг ігольнага завода тав. Шапіра. Ён адзначае, што работа няштатных інструктароў дрэнна арганізавана. Няштатныя інструктары не атрымліваюць належнага інструктажа і дапамогі з боку гаркома партыі. Іх рэдка склікаюць, з імі мала працуюць. Аб іх існаванні, можна сказаць, зусім забылі.

На вячэрнім пасяджэнні выступіў член бюро ЦК КП(б)Б тав. Галадзед. У сваёй прамове тав. Галадзед спыніўся на фактах прытуплення пільнасці, памылках, якія былі дапушчаны Саўнаркомам і ім асабіста. Ён мабілізаваў дэлегатаў партыйнай канферэнцыі на падняцце большэвіцкай пільнасці, выкарчоўванне астаткаў шкодніцтва і няўхільнае выкананне рашэнняў лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б).

Усяго ў спрэчках па справаздачнаму дакладу гаркома партыі выступіла 52 чалавекі з запісаўшыхся 99.

Сёння партыйная канферэнцыя прыступае да намячэння і абмеркавання кандыдатур у склад гарадскога камітэта партыі.

Арк. ЗАРУБЕЖНЫ.

БАРЫСАЎСКІ РАЕН

Больш трох гадзін тав. Майсееў рабіў справаздачны даклад аб рабоце раённага камітэта.

У дакладзе даволі падрабязна былі закрануты амаль усе важныя пытанні, якія датычаць работы партыйнай арганізацыі. Аднак пэўнага малюнку работы раённага камітэта канферэнцыя так і не атрымала.

Тав. Майсееў, напрыклад, меў поўную магчымасць на канкрэтных прыкладах дыверсійна-шкодніцкай і шпіёнскай дзейнасці трацкісцкіх і іншых лазутчыкаў замежных разведак падкрэсліць выключную важнасць указання таварыша Сталіна аб капіталістычным акружэнні. Але дакладчык чамусьці гэтага не зрабіў. Дэлегаты чулі ў дакладзе абасобленыя, разрозненыя факты выкрыцця шкодніцтва і шкоднікаў на тэрыторыі раёна, але так і не даведаліся, што-ж робіць раённы камітэт па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва.

Рэгістрацыя фактаў без неабходнага іх палітычнага аналіза, неўскрыццё памылак і недахопаў — характэрна для ўсяго справаздачнага даклада.

Тав. Майсееў умудрыўся нічога не сказаць аб тых адмоўных з'явішчах у рабоце райкома (бесклапотнасць, элементы падхалімства), якія стваралі спрыяючую глебу для падрыўной дзейнасці ворага. Не сказаў ён і аб тым, як-жа практычна перабудоўваў сваю работу райком, выходзячы з рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна.

Наогул у дакладзе крытыка і самакрытыка была своеасаблівая. Тав. Майсееў мімаходам сказаў аб тым, што ў часе справаздачна-выбарчых сходаў выявіліся такія буйныя недахопы ў рабоце райкома, як прытупленне пільнасці, заціск крытыкі, адрыў бюро райкома ад мас і т. д. Але ў пацвярджэнне гэтых, зусім правільных, ацэнак райкома дакладчык чамусьці не палічыў патрэбным прывесці ні аднаго факта, ні аднаго прыкладу.

Справаздачай райкома было занята ўсё ранішняе пасяджэнне канферэнцыі 16 мая. І толькі на вячэрнім пасяджэнні быў заслухан 15-мінутны даклад рэвізійнай камісіі.

Не гледзячы на змястоўныя размовы членаў бюро РК аб тым, што ўлічыўшы вопыт іншых арганізацый, барысаўская канферэнцыя пройдзе арганізавана,—гэтага, на жаль, пакуль не адчуваецца.

Канферэнцыя непрадукцыйна трапіць шмат часу. 15 мая пасяджэнне канферэнцыі закончылася на 40 мінут раней рэгламента.

Учора раніцой яна пачала сваю работу са спазненнем на 20 мінут. Да абедзенага перапынку (на які адводзіцца 3 гадзіны) можна было заслухаць даклад рэвізійнай камісіі, але гэтага не было зроблена. На пасяджэнні канферэнцыі дэлегаты спазняюцца.

Натуральна, што спробы выдаць за дэмакратыю парушэнні элементарнага парадку — як вядзенне партканферэнцыі, так і недыспыплінаванасць асобных дэлегатаў — павінны быць ліквідаваны.

***

На вячэрнім пасяджэнні 16 мая пачаліся спрэчкі па справаздачы райкома і рэвізійнай камісіі.

Сёння працяг спрэчак.

Ал. ЛЕБЕДЗЕЎ.

БАБРУЙСКІ РАЕН

Учора на ранішнім пасяджэнні партыйнай канферэнцыі быў заслухан справаздачны даклад аб рабоце райкома партыі. Нельга сказаць, каб чатырохгадзінны даклад сакратара райкома тав. Чэрнышова быў несамакрытычны. Самакрытыка была. Але на многім дакладчык не спыніўся. Ён ні словам не абмовіўся, як ідзе перабудова партыйнай работы ў суадносінах з рашэннямі Пленума ЦК ВКП(б) і ўказаннямі таварыша Сталіна. Мімаходам і агульна былі закрануты такія важныя пытанні, як работа комсамола і профсаюза.

Дакладчык гаварыў аб падхалімстве, угодніцтве, якое працвітала ў раёне, але аб падхалімах з кіруючых работнікаў раёна ён умоўчаў.

Не былі тав. Чэрнышовым раскрытыкаваны і падхалімскія выступленні на папярэдняй партканферэнцыі інструктара райкома т. Уздзенскага, сакратара РК ЛКСМБ тав. Марголіна. Затое калі справа дакладзіла да нізавых арганізацый, нізавых работнікаў, у дакладчыка знайшліся факты і прыклады.

На ранішнім пасяджэнні таксама быў заслуханы даклад старшыні рэўкамісіі тав. Багдановіча, які між іншым указаў, што за 1936 год рэвізіі не было, сама рэўкамісія ліквідавалася. Абследаванне фінансава-гаспадарчых спраў у первічных партарганізацыях не праводзілася. За мінулы год па адміністрацыйна-гаспадарчых расходах перарасход складае 24 тысячы рублёў. Былі факты неахайнага афармлення дакументаў на скарыстанне партыйных сродкаў. На ранішнім пасяджэнні выступіў адзін аратар.

На вячэрнім пасяджэнні прадаўжаліся спрэчкі па справаздачы райкома і рэўкамісіі.

Г. ВЯРХОЎСКІ.

АРШАНСКІ РАЕН

15 і 16 мая партыйная канферэнцыя абмяркоўвала кандыдатуры ў склад райкома партыі. У выніку адкрытага абмеркавання са спісу адведзена 32 чалавекі і пакінута для тайнага галасавання 48.

Дэлегаты выключна сур'ёзна адносяцца да вылучэння кандыдатур. У спісу для тайнага галасавання пакідаюцца лепшыя комуністы.

Трэба адзначыць, што дзелавая работа канферэнцыі дрэнна арганізавана. У зале шум. Старшыня прэзідыума тав. Соскін часта блытае парадак адкрытага галасавання, што выклікае законныя пратэсты.

Партыйная канферэнцыя засядае ўжо пяць дзён, а пакуль абмеркаваны толькі кандыдатуры ў склад членаў райкома. На канферэнцыі прысутнічаюць дырэктары прадпрыемстваў, соўгасаў, старшыні сельсоветаў і некаторых калгасаў, не гаворачы ўжо аб усіх партыйных кіраўніках. Бясспрэчна, што адсутнасць гэтых людзей на вытворчасці сур'ёзна адбіваецца на вытворчую і палітычна-масавую работу сярод рабочых.

Сёння партыйная канферэнцыя абмяркоўвае дэлегатаў на з'езд КП(б)Б. Патрэбна выбраць 27 дэлегатаў з рашаючым і 5 з дарадчым голасам.

У рабоце канферэнцыі прымае ўдзел старшыня рэвізійнай камісіі ЦК КП(б)Б тав. Кудзельскі.

АСТАПЕНКА.

МАГІЛЕЎСКІ РАЕН

МАГІЛЕЎ. 16 мая. Учора адбылося тайнае галасаванне ў члены гаркома партыі. Выбран 31 чалавек. Склад гаркома значна абноўлен — 20 чалавек выбраны ўпершыню ў гарком.

На ўчарашнім вячэрнім пасяджэнні абмяркоўваліся кандыдатуры дэлегатаў на з'езд КП(б)Б з правам рашаючага голаса.

Сёння на ранішнім пасяджэнні адбылося тайнае галасаванне. У часе работы шчотная камісія канферэнцыі абмяркоўвала кандыдатуры кандыдатаў у члены гаркома і члены рэвізійнай камісіі.

На вячэрнім пасяджэнні шчотная камісія абвясціла рэзультаты выбараў дэлегатаў на з'езд з правам рашаючага голаса. Замест патрэбных 30 дэлегатаў большасцю галасоў выбрана 27. У сувязі з тым, што аказаліся недавыбранымі тры дэлегаты, канферэнцыя доўга абмяркоўвала пытанне: ці давыбіраць трох дэлегатаў, ці не. Відаць, што з прычыны стомленасці канферэнцыі, яна ў першы раз пастанавіла недавыбіраць больш дэлегатаў, пазбавіўшы, такім чынам, магчымасці поўнасцю прадставіць магілеўскую партыйную арганізацыю на з'ездзе КП(б)Б. Толькі пасля паўторнага абмеркавання гэтага пытання канферэнцыя ўсё-ж рашыла давыбраць трох дэлегатаў.

Р. ДОДЗІН.

МОЗЫРСКІ РАЕН

Спрэчкі па справаздачнаму дакладу аб рабоце райкома на ранішнім пасяджэнні канферэнцыі 16 мая ў параўнанні з папярэднімі пасяджэннямі характарызаваліся большай завостранасцю. Яны былі накіраваны на ўскрыццё недахопаў работы і кіраўніцтва райкома партыі нізавымі первічнымі арганізацыямі.

На сходах первічных арганізацый комуністы рэзка крытыкавалі райком і інструктароў райкома за адарванасць ад первічных арганізацый і ад працоўных мас, за слабую дапамогу арганізацыям у рабоце. Аднак, гэта крытыка не паслужыла для іх урокам. Выбары нізавых парторганаў скончыліся ўжо каля двух месяцаў назад. Але ў большасці первічных арганізацый раёна ніхто з работнікаў райкома яшчэ не быў. Дэлегат канферэнцыі Баброў з первічнай арганізацыі Дудзіцкага сельсавета ў сваім выступленні ўказаў, што інструктар райкома пасля выбарчага схода арганізацыі, які адбыўся больш месяца назад, больш не заглядаў у арганізацыю і не ведае, як яна працуе зараз.

Дэлегаты рэзка крытыкавалі старшыню мозырскага райвыканкома тав. Буякова (ён-жа член бюро райкома) за яго адарванасць ад мас, палітычную блізарукасць і прытупленне рэвалюцыйнай пільнасці.

На канферэнцыі крытыкавалі і недахопы кіраўніцтва партыйнай работай з боку Мозырскага акруткома партыі. Выступаючыя дэлегаты ў спрэчках указвалі, што бюро акруткома таксама не зрабіла для сябе неабходных вывадаў з рашэнняў Пленума ЦК і даклада таварыша Сталіна. Акругком па-ранейшаму мала аддае ўвагі Мозырскаму раёну, які з'яўляецца ў акрузе галаўным і павінен служыць прыкладам у пастаноўцы партыйнай работы для астатніх раёнаў. Мозырскі раён павінен з'яўляцца асноўнай базай для вырошчвання новых партыйных кадраў. Аднак гэта справа ў Мозырскім раёне абстаіць зусім дрэнна. У сваім выступленні сакратар акруткома тав. Ананьеў па-большэвіцку прызнаў крытыку па адрасу акруткома зусім правільнай, падкрэсліўшы, што акругком зрабіў толькі першыя крокі ў напрамку перабудовы работы.

Спрэчкі па дакладу аб рабоце райкома працягваліся і на вячэрнім пасяджэнні канферэнцыі 16 мая.

Р. ФРАЛОЎ.

НЯМА БАРАЦЬБЫ ЗА ХУТЧЭЙШАЕ СКАНЧЭННЕ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Свяцілавішкі раён недапушчальна адстае ў правядзенні веснавой пасеўнай кампаніі. На 10 мая план сяўбы яравых выкананы толькі на 55 проц. Ні адна пяцідзенка па гэтаму раёну не дала патрэбнага пералому ў ходзе сяўбы.

Прычыны ганебнага адставання крыюцца, у першую чаргу, у тым, што сяўба ў калгасах не арганізавана і раённыя арганізацыі не мабілізавалі масы калгаснікаў і калгасніц на барацьбу за высокі ўраджай. Вось дзве лічбы, якія характарызуюць тое, як у раёне клапоцяцца аб сяўбе: калгасы на 10 мая засеялі ўсіх яравых 56,7 проц., а калгаснікі на сваіх сядзібах пасеялі 67,7 проц.

З гэтага зусім відавочна, што калгаснікі больш працуюць на сваіх сядзібах, а калгаснае поле пакідаюць незасеяным. Гэта шкодная практыка вельмі ўкаранілася ў Свяцілавіцкім раёне. Яна сведчыць аб тым, што ў калгасах дрэнна арганізавана праца, слабая працоўная дысцыпліна.

У калгасе «Перамога», Акшынскага сельсавета, класавыя ворагі, з мэтаю сарваць веснавую сяўбу, павялі сваю шкодную работу на падрыў лысцыпліны. У выніку — на работу калгаснікі выходзяць у 10—11 гадзін, а некаторыя зусім не заняты на калгасных палях і працуюць на сваіх агародах. Сяўба-ж яравых у калгасе зрываецца.

Старшыня калгаса Ф. Баранаў глядзіць на ўсё гэта скрозь пальцы. Ён самаўхіліўся ад кіраўніцтва калгаснай гаспадаркай, пусціў сяўбу на самацёк. Калгаснікі не мабілізаваны на хутчэйшае і высокаякаснае правядзенне веснавых пасеўных работ.

Або ўзяць калгас «Шлях Ільіча», Яноўскага сельсавета. Слабы ход сяўбы ў гэтым калгасе тлумачыцца таксама выключна дрэннай арганізацыяй працы. Брыгадзір 3-й брыгады Самажонаў Павел вельмі рэдка бывае на полі, не вядзе ўліку працы. Калгаснікі не ведаюць, колькі хто выпрацаваў, бо працадні не запісваюцца. І тут класавы вораг скарыстоўвае бязадзейнасць брыгадзіраў у сваіх мэтах. Калі-ж насценная газета выступіла з крытыкай работы Самажонава, апошні ў прысутнасці калгаснікаў сарваў з насценгазеты заметку. Старшыня калгаса Максіменка, як і Самажонаў, не любіць крытыкі і самакрытыкі, зажымае яе і гэтым самым замазвае недахопы. А гэта толькі адбіваецца на арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгаса, на росце заможнасці калгаснікаў.

Падобныя факты маюць месца ў многіх калгасах раёна. Адсутнасць барацьбы за хутчэйшае сканчэнне сяўбы і высокую якасць прывялі раён да прарыву. На сяўбе, як правіла, не разгорнута социялістычнае спаборніцтва, прапа на полі праходзіць скопам, няма здзельшчыны, ігнаруецца стахановскі рух. Сельскія советы і правленні калгасаў забылі на тое, што правільная арганізацыя працы вырашае поспех сяўбы. Яны не кіруюць і не ліквідуюць брыгадам, звенням, стахановцам. Штодзённыя клопаты аб сяўбе падмянілі пустой гаварыльняй. Як вынік, калгаснікі не мабілізаваны на хутчэйшае сканчэнне сяўбы, працуюць на сваіх агародах, а на калгасных палях нікога няма.

Як відаць, раённыя арганізацыі не вывучылі прычын адставання свайго раёна ў сяўбе і не прынялі ніякіх мер да ліквідацыі іх. Райзеваддзел і машынна-трактарная станцыя штодзённую сувязь і дапамогу калгасам падмянілі зборам зводак, якія з пяцідзенкі ў пяцідзенку фіксуюць ганебнае адставанне ў веснавой пасеўнай кампаніі. Канкрэтных-жа мер для ліквідацыі прарыву не прымаюць.

А. Л.

Выканаць план радковай сяўбы

Даўно ўсім вядома, што радковая сяўба намнога павышае ўраджайнасць. Аднак, у многіх раёнах нашай рэспублікі проста ігнаруюць радковыя сеялкі; сяўбу калгасы праводзяць уручную.

Напрыклад, у Чырвонаполлі радковымі сеялкамі пасеяна толькі 8,2 проц. зернавых, у Плешчаніцкім раёне — 8,7 проц., у Асіпавіцкім — 7,2 проц., у Свяцілавіцкім — 7,3 проц., у Расонскім — 9,9 проц., у Чэрвеньскім — 4,1 проц.

Ва ўсіх гэтых раёнах трактарныя і конныя сеялкі не скарыстоўваюцца; калгасы сеюць уручную. Характэрна, што аграномы і кіраўнікі раёнаў добра ведаюць аб гэтым, але мер ніякіх не прымаюць, каб поўнасцю скарыстаць на сяўбе радковыя сеялкі. Яны толькі пасіўна наглядаюць тое, як ігнаруюцца сеялкі.

Антымеханізатарскія настроі, ігнараванне радковай сяўбы наруку толькі класаваму ворагу, які ўсякім спосабам імкнецца пашкодзіць нашай барацьбе за высокі ўраджай. Няўжо не разумеюць гэтага дырэктары машынна-трактарных станцый і кіраўнікі памянёных вышэй раёнаў?

Нельга далей цярпець такое становішча. Трэба прыняць усе меры да таго, каб план радковай сяўбы выканаў кожны калгас і соўгас. Поўнасцю выкарыстаць на сяўбе ўсе конныя і трактарныя сеялкі!

С.

Перадавая трактарная брыгада

Арганізаваная ў 1937 годзе новая машынна-трактарная станцыя ў Мсціжы, Бягомльскага раёна, абслугоўвае 59 калгасаў Домжарыцкага, Недальскага, Мсціжскага і іншых сельсоветаў.

Яшчэ да выезду трактараў у поле паміж брыгадамі і кожным трактарыстам паасобку былі заключаны социялістычныя дагавары на лепшыя паказальнікі працы. Узятыя трактарыстамі абавязацельствы выконваюцца з поспехам. На 11 мая трактарны парк машынна-трактарнай станцыі выканаў план палявых работ, у пераводзе на мякае ворыва, на 133 проц.

З 6 працуючых на палях трактарных брыгад наперадзе ідзе шостая (брыгадзір тав. **Пятроўскі**). Гэта брыгада, па праву, лічыцца стахановскай. Пры плане веснавых работ у 195 гектараў, на 11 мая брыгада апрацавала 523 гектары і зэканоміла гаручага 1.500 кілограмаў.

Лепшы трактарыст-стахановец тав. **Клімашэўскі** Эдуард на сваім трактары штодзень выконвае норму выпрацоўкі на 200—250 проц. Ён беражліва адносіцца да машыны. Трактар, на якім ён працуе, не ведае прастояў і халастых, непатрэбных перагонаў. З пачатку веснавых работ ён узараў 260 гектараў, што складае 250 проц. да плана.

На 200 проц. выканаў заданне веснавых работ трактарыст тав. Камінскі Васіль, а тав. Дударонак Васіль выканаў сваё заданне на 170 проц. Якасць праведзеных работ добрая.

За ўдарную стахановскую працу дырэкцыя машынна-трактарнай станцыі прэміравала грашыма як брыгадзіра, так і трактарыстаў 6-й брыгады.

П. ШУРАЎ.

НАША РАДЗІМА

ВУГАЛЬНЫЯ БАЗЫ НА УСХОДЗЕ

Аб тым, што ў Кузнецкім басейне ёсць вугаль і жалеза, было вядома з даўніх часоў. Царскія сатрапы, пакарыўшыя Сібір, пабудавалі ў пачатку XVII века кропасць у Кузнецку, каб трымаць у паслухмянасці туземныя плямёны і збіраць з іх ясак (даніну), пераважна жалезам. За гэта і празвалі яны мясцовыя плямёны «Кузнецкамі».

Рускі капіталізм не знайшоў у сябе ні сіл, ні здольнасцей арганізаваць эксплаатацыю велізарных багацяў Кузнецкага басейна. Толькі перад самай імперыялістычнай вайной было створана акцыянернае таварыства «Копікус» («Копі кузнецкага басейна») са смешаным рускафранцузскім капіталам. Гэта таварыства насілася з думкай пабудаваць металургічны завод, але далей першапачатковых вышуканняў справа не пайшла.

З першых гадоў устанаўлення совецкай улады большэвікі ставяць пытанне аб неабходнасці стварэння магутнай прамысловасці для эксплаатацыі незлічоных багацяў Кузнецкага басейна.

У 1918 годзе, калі Совецкая Расія была адрэзана ад паўднёвай металургічнай базы, В. І. Ленін пісаў: «Расійская Совецкая Рэспубліка знаходзіцца настолькі ў выгодных умовах, што яна мае нават пасля Брэсцкага міру гіганцкія запасы руды (на Урале), апалу ў Заходняй Сібіры (каменны вугаль), на Каўказе і на паўднёвым усходзе (нафта), у цэнтры (торф), гіганцкія багацці лесу, водных сіл, сыравіны для хімічнай прамысловасці (Карабугаз) і т. д. Распрацоўка гэтых натуральных багацяў прыёмамі навейшай тэхнікі ласць аснову небывалага прагрэса прадукцыйных сіл» (том XXII, стар. 453).

Такім чынам В. І. Леніным у гэтай фармуліроўцы была дана шырокая пастаноўка праблемы выкарыстання рэсурсаў на Ўсходзе краіны для мэт індустрыялізацыі.

Кузбас ёсць другая агульнасаюзная база вугалю. Таму правільна будзе пачаць з параўнання яе з Данецкім басейнам. Агульныя запасы Данбаса ацэньваюцца ў 72 мільярды тон, а Кузбаса ў 445 мільярдаў тон, гэта значыць Кузбас мае вугалю ў 6 разоў больш, чым Данбас. Пры такой-жа плошчы, як Данбас (26 т. кв. км.), магутнасць пластоў Кузбаса значна большая.

Каб наглядней уявіць размер запасаў Кузбаса, можна прывесці наступнае параўнанне. Дапусцім на момант, што ўвесь вугаль, заключаны ў нетрах Кузбаса, выкапан на паверхню, тады ўся паверхня Кузбаса аказалася-б пакрытай вугальным пластом вышынёй каля 20 метраў, гэта значыць такой вышынёй, якую маюць чатырохпавярховыя дамы.

Кузбас мае магутныя запасы вугалю, які дае вельмі добры кокс, што мае велізарнае значэнне для развіцця чорнай металургіі Урала-Кузнецкага камбіната і Заходняй Сібіры ў прыватнасці. У Пракоп'еўскім раёне (па выразу некаторых «жамчужыне Кузбаса») ёсць гатункі вугалёў, якія непасрэдна ў сырым выглядзе могуць ісці ў доменную плаўку, замяняючы кокс. Ёсць і газавыя вугалі, якія ўтрымліваюць у сябе да 60 проц. лятучых вяшчэстваў і з'яўляюцца таму вельмі каштоўнымі, як хімічная сыравіна.

Ёсць пласты ў некалькі дзесяткаў метраў таўшчынёй. Пры гэтым залягання куды бліжэй да паверхні, чым у Данбасе, і таму здабыча вугалю тут абыходзіцца значна таней.

Наяўнасць Кузбаса робіць Заходнесібірскі край адной з асноўных энергетычных баз СССР. Яшчэ ў 1928 годзе здабыча вугалю ў Кузбасе складала ўсяго 7 проц., а ў 1934 годзе, не гледзячы на рост усіх вугальных басейнаў, ужо 13 проц. агульнай здабычы Саюза. З дарэвалюцыйнага часу здабыча ў ім вырасла ў 25 разоў.

У дакладзе на 17 партыйным з'ездзе таварыш Сталін высунуў лозунг: «Ператварыць Кузбас у другі Данбас». Гэты лозунг з'яўляецца лагічным працягам пастаўленай партыяй задачы стварэння другой вугальнаметалургічнай базы на Ўсходзе.

Асноўнымі спажыўцамі кузнецкага вугалю, апрача электрастанцый і т. д., з'яўляюцца Магнітагорскі завод (Урал) і Кузнецкі завод. Можна сабе ўявіць колькі вугалю паглынае Магнітагорскі гігант, які ў 1936 годзе даў 1557 тыс. тон чыгуну, 1164 тыс. тон сталі і 947 тыс. тон прэкату. Для пагрузкі ўсёй гэтай прадукцыі патрэбны звыш 200 тыс. вагонаў. Не намнога менш яго і Кузнецкі гігант. Прадукцыя гэтых двух гігантаў у 1936 годзе складала каля 60 проц. сталі, выпускаемай усімі заводамі царскай Расіі ў 1913 годзе.

Магнітагорскі завод, пабудаваны на пустым месцы, прадстаўляе сабой разам з Кузнецкім заводам важнейшую частку Урала-Кузнецкага камбіната. Супроць стварэння яго ў свой час выступалі трацкісты і правыя, і будаўніцтва яго тармозілі гэтыя шкоднікі.

У якасці аднаго з іх «важкіх» даводаў супроць будаўніцтва было спасылане на немінучы высокі сабекошт чыгуна з-за прывознага здалёку кузнецкага вугалю і стратнасці ў сувязі з гэтым работы завода. Жыццё зло насмяялася над карканнем трацкісцкіх воранаў. Ужо ў 1936 годзе, яшчэ да поўнага сканчэння будаўніцтва, чыгун «Магніткі» аказаўся самым танным у Саюзе.

Кузбас ператвараецца ў басейны буйных шахт, у басейн шахт гігантаў. Кузбас развіваецца новымі шляхамі, якіх Данбас не ведаў. Дарэвалюцыйны Данбас рос у значнай ступені за кошт стварэння невялікіх і дробных шахт, прымітыўна абсталяваных, дзе праца была падобна працы землякопа, узброенага кіркай і лапатай. Кузбас, стваракмы совецкай уладай, расце быстрымі тэмпамі; шахты абсталяваны магутнымі пад'ёмнікамі. Яны аснашчаны пад зямлёй сучаснымі механізмамі для здабычы і транспартыроўкі вугалю: адбойнымі малаткамі, урубавымі машынамі, электрычнымі свідравальнікамі, электравозамі. Недарма на 17 з'ездзе партыі тав. Орджанікідзе гаварыў аб высокай механізацыі прамысловасці ў Кузбасе.

Школніцкія шайкі нямала папрацавалі над тым, каб сарваць большэвіцкія планы развіцця Кузбаса. Роля Кузбаса па дырэктывах «промпартыі» праўмяншалася пры складанні пяцігодкі і, ў прыватнасці, залання на 1930-31 гг. Трацкісцкія бандыты ў 1936 годзе стваралі аварыі, узрывы і зноў зрывалі работу. Аднак, злачынныя махінацыі ворагаў выкрыты, і наперакор іх волі расце і шырыцца другая вугальная база СССР — Кузбас.

***

Да імперыялістычнай вайны аб Караганде было вельмі мізэрнае ўяўленне. Караганда ў «Очерке месторождений ископаемых углей России» коратка ўспамінаецца пад скромным тэрмінам «копь»: там сапраўды працавала для невялікага медната завода (Спаскага, які належаў англійскаму акцыянернаму таварыству) усяго адна дробная капальня з дабычай вугалю каля 30 тыс. тон у год.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі думка аб выкарыстанні Караганды ўзнікла ў сувязі з планамі шырокага чыгуначнага будаўніцтва ў Казахстане і паўднёвай Сібіры. У 1920 годзе пачынаюцца геалагічныя доследы гэтага раёна. Хоць геалагічная разведка нетраў далёка яшчэ не закончана, але ўжо атрыманыя матэрыялы даюць падставу меркаваць, што Караганда па геалагічных запасах блізка падыходзіць да Данецкага басейна.

15 жніўня 1931 года ЦК ВКП(б) указаў, што «геаграфічнае становішча Карагандзінскага басейна, наяўнасць велізарных запасаў вугалю, іх каксуемасць, спрыяючы характар залягання вугалю патрабуюць хутчэйшага стварэння на базе вугальных месцанараджэнняў Караганды трэцяй магутнай вугальнай базы СССР».

У геаграфічных адносінах вугальная Караганда размешчана вельмі ўдала. Яна легласць Магнітагорск — Караганда складае 1200 кілометраў. Яшчэ бліжэй Караганда размешчана ў адносінах да буйнейшага Халілоўскага жалезаруднага рабіна. Аллегласць Халілава — Караганда 1159 кілометраў супроць 2481 кілометра Кузбас — Халілава.

Караганда — асноўная апалавая база будуючыхся гігантаў каляровай металургіі ў Казахстане — Коунрада, Карсакпая, для забеспячэння чыгунак — Турксіб, Караганда—Балхаш, Заходняй Сібіры і сярэдняй Азіі. Якасць і ўласцівасць карагандзінскіх вугалёў зусім задавальняе патрабаванні асноўных галін народнай гаспадаркі — металургіі, хіміі і т. д.

У 1936 годзе Караганда дала 3,8 млн. тон вугалю. Такім чынам нікчэмная «копь», якой была Караганда ў даваенным перыяд, вырасла зараз у магутную базу, якая снабжае вугалем буйнейшыя прадпрыемствы чорнай і каляровай металургіі.

Б. ЛІБЕРМАН.

АБМЕРКАВАННЕ ПЫТАННЯЎ ТРЭЦЯГА ПЯЦІГАДОВАГА ПЛАНА

За энергахімічнае скарыстанне торфу

Агульнавядома, што Беларуская ССР ата вялікімі запасамі торфу. Бадай, не зе пераўвелічэннем сказаць, што торф ССР з'яўляецца найбольш распаўсю- ным і багатым па тэхналагічных маг- часных вілам карысных выкапняў.

і года ў год расце здабыча торфу як энергетыкі, так і для ўгнаення. Доля ру ў нашым цаліўным балансе ўвесь павялічваецца і будзе павялічвацца лей яшчэ большымі тэмпамі.

Ніж тым, з усіх відаў паліва торф най- ш дарагі: ён танэй толькі за дровы.

Дзюль значыць, што пытанню больш ыянальнага выкарыстання торфу, пы- таню зніжэння яго кошту ў энергетыцы а аддаць максімум увагі.

Цыянальнае выкарыстоўванне торфу ергэтыцы павінна ажыццяўляцца шля- далейшай механізацыі торфаздабычы, нага боку, і комплекснага энергахі- ага выкарыстоўвання яго, з другога. учасны момант можна лічыць устаноў- м, што газіфікацыя торфу з смола- лізаннем пры рацыянальнай схеме пе- рацоўкі тарфяной смалы карэнным ам мяняе ўсю эканоміку ўжывання у.

на тона торфу, ператвораная ў газ, нае 0,225 тоны нафты і адначасова да 7 проц. смалы. Шляхам хімічнай апрацоўкі тарфяной смалы і ачысткі мольных вод можна атрымаць рад мі патрэбных у нашай народнай гас- рцы высокакаштоўных прадуктаў.

тарфяной смалы здабываюць наступ- прадукты:

. воск, неабходны ў палым радзе галін ай прамысловасці, галоўным чынам у абутковай;

. фенолы, годныя для атрымання пла- ных мас і высокакіпячыя фенолы, ныя для атрымання сінтэтычных дубі- ў;

. антысептыкі, маючыя прымяненне ў гары і ветэрынарыі.

ляхам каксавання пека, атрымоўвае- пры разгоне смалы, можна здабыць: Нэкавы кокс, годны для вытворчасці льных электродаў;

вадкае паліва характару бензіна;

высокакаларыйны газ, які можа яцца ў якасці гаручага для аўта- яў, і інш. каштоўныя прадукты. З мольнай вады можна атрымаць вопат- кіслату, аміяк і фенолы.

эба адзначыць, што з торфу атры- ецца мінімум у 10 раз больш фено- чым пры каксаванні каменнага ву- . Тут яшчэ трэба ўпамянуць аб пра- ных Інстытутам прамысловасці вопы- па выкарыстоўванню тарфяной залы атрымання абліцовачных пліт, якія зусім становуць рэзультаты.

даных хімсектара Гіпраторфа, кошт атаў з тарфяной смалы, у залежнасці даўнаты схемы пераапрацоўкі яе, хі- ца паміж 20 руб. і 35 руб. на 1 то- пераапрацаванага торфу. Перавод Арэ- Зуеўскай электрастанцыі з тарфянога на газавае (з газагенератарнай цыяй па торфу) па даных Глаўторфа е кошт адной мега-калорыі з 19 руб. . да 10 р. 80 к., г. зн. на 45 проц. ймпрывезеныя даныя агалошаны ў дзе Глаўторфа на апошняй торфахі- ой канферэнцыі ў студзені 1937 г.).

ытанню энергахімічнага выкарыстоў- торфу ў нас у Саюзе адлаюць вя- ю ўвагу Наркамат цяжкай прамысло- і Глаўторф. Не гледзячы на проці- не з боку ворагаў народу Пятакова і торфахімія рухаецца наперад.

станцыі Рэдкіно пабудаван і ўжо одзіцца ў эксплаатацыі першы ў Саю- торфахімічны камбінат. У склад Рэд- ага камбіната ўваходзіць, апрача торфакаксавальнага завода, смоларазгонны завод, васкавы і фенольны цэхі і будуецца цэх па пераапрацоўцы пека. Смала дастаўляецца з газагенератарных станцый і з каксавальнага завода.

У гэтым годзе будзе пабудаван вялікі смалапераапрацоўваючы завод на Урале (у Н. Тагіле) для пераапрацоўкі смалы з уральскіх газагенератарных станцый.

Дакладчык Глаўторфа на апошняй торфахімічнай канферэнцыі заявіў, што «патаннення выкарыстоўвання торфу ў энергетыцы з'яўляецца вядучай задачай стаячай перад Глаўторфам» і, што «Глаўторф мяркуе стаць пастаўшчыком газу замест торфу, што ў корані зменіць тарфяную прамысловасць».

У нас, у БССР, вядома, няма такіх сканцэнтраваных у адным месцы буйных спажыўцоў паліва, якія ёсць у Глаўторфа. Усё-ж і ў нас трэба ставіць пытанне аб пабудове ў трэцяй пяцігодцы газагенератарных станцый пры буйных прамысловых пэнтрах з тым, каб забяспечыць газам прамысловыя прадпрыемствы і комунальна-бытавых спажыўцоў. Для пераапрацоўкі смалы з усіх газагенератарных станцый трэба будзе пабудаваць алзін буйны камбінат.

Хімічная пераапрацоўка ачосу з атрыманнем спірта і інш. прадуктаў, а таксама пераапрацоўка пня на вугаль і смалу, усё гэта звязана з комплексным выкарыстоўваннем нашых тарфяных багаццяў. Як ачос, так і пень з'яўляюцца адыходам на торфараспрацоўках.

У заключэнне трэба астанавіцца і на іншым шляху энергахімічнага выкарыстоўвання торфу, на яго каксаванні. Пры каксаванні торфу атрымоўваецца кокс і смала. З смалы каксавання можна выдзяляць тыя-ж каштоўныя прадукты, што і з газагенератарнай смалы. Што датычыць тарфянога коксу, то ён можа знайсці ў нас прымяненне ў якасці гаручага для аўтамабільных генератараў. Па вестках замежнага друку, тарфяны кокс з'яўляецца лепшым гаручым для аўтамабільных генератараў з аб'ёмам газу зверху, роўна з драўняным вугалем; у адносінах кошту кокс мае перавагу перад драўняным вугалем. У нас, у Саюзе, таксама вядзецца работа па канструяванню аўтамабільных генератараў на розных відах паліва. Па маючыхся вестках Навукова-даследчы аўтатрактарны інстытут атрымаў вельмі станоўчыя рэзультаты па прымяненню тарфянога коксу ў аўтамабільных генератарах.

Такім чынам тарфяны кокс можа выклікаць рашучыя зрухі ў справе пераводу грузавога аўтатранспарта і трактарнага парка на газагенератары. Эканамічны эфект замены далёкапрывазнога паліва прадуктамі, атрымоўваемымі з торфу, бясспрэчан і зусім зразумела, што пытанне аб пабудове ў БССР торфакаксавальнага завода з'яўляецца вельмі актуальным.

Неабходна ў бягучым годзе закончыць балансавыя вопыты па Міханавіцкай торфакаксавальнай устаноўцы. Калі гэтыя вопыты дадуць нават адмоўны рэзультат, то трэба будзе астанавіцца на такім праваленым каксавальным агрэгаце, якім з'яўляецца печка Пінча, якая знаходзіцца ў эксплаатацыі на Рэдкінскім торфахімкамбінаце.

Зараз-жа неабходна вылучыць гаспадарчую арганізацыю, якая занялася-б пытаннямі развіцця торфахіміі ў БССР у трэцяй пяцігодцы. Белторф да гэтага часу зусім не займаўся гэтай праблемай.

Пытанні торфахіміі ў трэцяй пяцігодцы БССР павінны знайсці ўсебаковае абмеркаванне на старонках нашага друку.

Старшы навуковы работнік Інстытута прамысловасці Л. ГУРЭВІЧ.

Наладзіць вытворчасць абліцовачных матэрыялаў

Для аддзелкі знадворных фасадаў і ўнутраных частак будынкаў усё яшчэ ўжываецца звычайны тынк з наследуючай яго афарбоўкай у сумныя шэрыя колеры. Палобная аддзелка хутка блякне, стварае падцёкі, будынак набывае непрыемны выгляд. У галіне архітэктурна-мастацкай аддзелкі і выбару сродкаў для яе многія нашы будоўлі страдаюць моцнай абмежаванасцю, упрашчэнствам і негарманічнасцю. Даследчая-ж мысль гэтаму пытанню належнай увагі да гэтага часу не аддае.

У сучасны момант з велізарным ростам соцыялістычнага будаўніцтва, якое разгарнулася ў другой пяцігодцы, калі патрабаванні да архітэктурна-мастацкага афармлення нашых будынкаў вельмі ўзраслі, адчуваецца найвялікшая патрэба ў такіх абліцовачных матэрыялах, якія па сваіх якасцях і знешняму выгляду маглі-б служыць у дастатковай меры мэтам мастацкага афармлення нашых соцыялістычных пабудоў.

Сыравінная база БССР можа поўнасцю забяспечыць у некаторых галінах патрэбы архітэктурна-мастацкага афармлення нашых соцыялістычных пабудоў: тэатраў, клубаў, школ, помнікаў і т. д.

Крысталічныя пароды, якія знаходзяцца ў нас у паўднёвай частцы БССР (Глушковічы) і ў бліжэйшых раёнах УССР, адведзеных для эксплаатацыі БССР (Оўруччына), як-та шэрыя і чырвоныя граніты, чорныя з зялёнаватым адценнем габро і пераліваючыяся рознымі колерамі лабрадарыты, якія з'яўляюцца найбольш прыгожымі каменнямі ў свеце, і чырвоныя, шэрыя, ружаватыя пясчанікі могуць служыць добрым матэрыялам для архітэктурна-мастацкага афармлення нашых будынкаў і помнікаў.

У трэцяй пяцігодцы з ажыццяўленнем рэканструкцыі нашых гарадоў неабходна шырока разгарнуць эксплаатацыю ў гэтых горных адводах багацейшых залежаў крысталічных парод і арганізаваць іх апрацоўку для атрымання натуральных абліцовачных матэрыялаў.

БССР мае таксама багатую сыравінную базу для атрымання керамічных абліцовачных матэрыялаў. Абліцовачныя керамічныя пліткі, як ганчарныя, так і фаянсавыя, афармленыя майёлікай, падглазурнай жываписсю, каляровымі эмалямі і глазурамі аднаўленчага агню, з'яўляюцца вельмі каштоўнымі ў архітэктурна-мастацкіх адносінах абліцовачнымі матэрыяламі.

Выраб майёлікавых абліцовачных керамічных плітак, а таксама тэракоты можа быць пастаўлен на керамічных заводах Копыся, Менска, Барысава, Віцебска, Магілева і інш. Лепшыя азёрныя гліны, так званыя «сінюгі» і выдатныя лентачныя гліны Віцебска, Полацка, Барысава, Бярэзіны і інш. з'яўляюцца багатай базай для арганізацыі вытворчасці керамічных плітак і майёлікі, а таксама скульптурных афармленняў (тэракота).

Гаворачы аб керамічных абліцовачных матэрыялах, нельга абыйсці моўчкі таксама вытворчасць абліцовачнай цэглы. Наша сыравіна зусім прыгодна для вырабу абліцовачнай цэглы розных афарбовак ад светла-жоўтых да цёмна-чырвоных і карычневых адценняў. Аднак, да гэтага часу ні адзін з нашых цагельных заводаў не выпрацоўвае яе.

Арганізацыя вытворчасці керамічных абліцовачных матэрыялаў яшчэ да гэтага часу не наладжана. У трэцяй пяцігодцы трэба разгарнуць шырока вытворчасць высокаякасных мастацка афармленых керамічных абліцовачных матэрыялаў.

Трэцім відам абліцовачных матэрыялаў, для атрымання якіх ёсць шырокія магчымасці ў БССР, з'яўляюцца каляровыя шкляныя пліты, якія могуць даць багатую палітру колераў розных адценняў. Каляровая шкломаса можа служыць добрым матэрыялам для мазаічных манумэнтальных работ. Не гледзячы на наяўныя магчымасці, вытворчасць гэтых відаў абліцовачных матэрыялаў да гэтага часу не пастаўлена на нашых заводах.

Беларускай архітэктурнай і мастацкай грамадскасці, горсоветам, Наркамату комунальнай гаспадаркі і Наркаммясцпрому неабходна пры складанні плана ўлічыць усе гэтыя важнэйшыя пытанні.

Старшыя навуковыя работнікі Навукова-даследчага інстытута прамысловасці БССР

МІХАЛАП Н. П., ШАПІРА Д. І.

Тав. ГАНЧАРОНАК Ліза Фёдараўна — токар завода імя Кірава (Менск), перавыконвае новыя нормы на 120 проц. Тав. Ганчаронак — былая афіцыянтка сталовай завода імя Кірава. НА ЗДЫМКУ: т. Ганчаронак за работай.

Фото Я. Салавейчыка.

„НЯМА ЧАСУ ЗАЙМАЦЦА ШКОЛАМІ"

(Пісьмо былога вучня)

Летась я паспяхова скончыў 4 клас Уюнаўскай няпоўнай сярэдняй школы, Быхаўскага раёна. Сёлета абавязкова павінен быў ужо вучыцца ў 5 класе. Але атрымалася інакш. Восенню са мной здарыўся няшчасны выпадак. Я зламаў руку. Прахварэўшы многа часу, я далёка адстаў па вучобе ў 5 класе і не змог у ім навучацца. Для таго, каб працягваць вучобу рашыў наведваць вячэрнюю школу.

Але ў палове лютага ў час майго прыходу на заняткі, дырэктар гэтай школы **Салановіч** беспадстаўна прыдраўся да мяне, быццам-бы я сарваў школьную насценную газету. Дырэктар школы бярэ мяне за каўнер, адводзіць у настаўніцкую і прымушае прызнацца. Тут я гаварыў, што сарваў газету не я, а хто сарваў — не бачыў. Тады Салановіч збіў мяне да непрытомнасці, узяў за руку і заявіў: «Пойдзем да твайго бацькі».

Калі мы прайшлі каля 50 крокаў. Салановіч яшчэ два разы мяне ўдарыў. Я паваліўся ў снег. Падняўшыся сказаў: «Совецкія настаўнікі не б'юцца».

У выніку такіх здзекаў нада мной з таго часу я баюся наведваць вячэрнія заняткі.

Яша АНДРЭЕНКА.

* * *

БЫХАЎ. **(Ад спец. кар. «Звязды»).** Пры праверцы пісьма былога вучня Яшы Андрэенка ўказаныя факты поўнасцю пацвердзіліся.

На чале Уюнскай няпоўнай сярэдняй школы, Быхаўскага раёна, стаіць **Салановіч А. М.,** які ў 1919—21гг., будучы членам партыі, актыўна выступаў супроць генеральнай лініі партыі, а зараз узводзіць варожы паклёп на партыю. Працуючы ў школе, ён канчаткова разваліў яе работу. Вучні са школы выпускаюцца з вельмі малымі ведамі і непісьменнымі.

Не лепш абстаіць справа і ў гэтым навучальным годзе. Школа ўкамплектавана невукамі-настаўнікамі. Нямецкую мову дырэктар школы даручыў выкладаць піонер-работніку т. Паўлаву, які толькі што скончыў сямігодку. Можна ўявіць сабе, як Паўлаў справіўся са сваёй адказнай задачай.

Яшчэ горш абстаіць справа з выкладаннем роднай мовы, якая даручана маладому настаўніку Будніцкаму. У 5-х класах ён яшчэ не прапрацаваў і паловы праграмнага матэрыялу. Вучні пішуць непісьменна.

Салановіч вельмі груба адносіцца да вучняў. Некаторыя вучні за малейшы ўчынак выкідваюцца на вуліцу, або беспадстаўна выключаюцца са школы (Падкапаеў і інш.). Апрача лаянак, грубасці, надання розных абразлівых мянушак вучням і збіенняў, іншага абыходжання ён не прызнае. Так, вучня 5-га класа Бондарава Федзю аднаго разу схапіў за каўнер і штурхануў.

Злачынная дзейнасць Салановіча не трывожыць быхаўскія раённыя арганізацыі і ў першую чаргу райана. Тут спакойна наглядаюць за агіднымі антысовецкімі дзеяннямі Салановіча.

Пры такім «аператыўным» кіраўніцтве РК КП(б)Б і райана ў радзе школ раёна дагэтуль беспакарана арудуюць класава-варожыя элементы. Так, пад самым носам кіраўнікоў раёна ў Нова-Быхаўскай НСШ ўжо доўгі час дзейнічае Тамашоў, які вучням усхваляе контррэволюцыянера Троцкага. Але раённыя арганізацыі з гэтага факта не зрабілі яшчэ сур'ёзных вывадаў. Тамашоў і зараз яшчэ працуе ў школе.

Дырэктарам Верхне-Ташчынскай няпоўнай сярэдняй школы працуе Мачурскі. Як толькі быў апублікаваны праект Канстытуцыі БССР, ён сярод настаўнікаў стаў выказваць свае антысовецкія погляды. Мачурскі рассявае ў школе вялікадзяржаўны шавінізм. Вучняў-украінцаў ён абзывае абразлівымі мянушкамі.

У Быхаўскім раёне патураюць пралезшым у рады настаўнікаў класавым ворагам, якія праводзяць сваю шкодную справу. У райком, райвыканком, рэдакцыю раённай газеты «Маяк комуны» паступаюць шматлікія сігналы аб варожай дзейнасці ў школах. Але на ўсё следуе адзін адказ: «Няма часу займацца школамі».

В. АСТРОЎСКІ.

ЗЛАЧЫННЫЯ СПРАВЫ СТАРШЫНІ КАЛГАСА ДЗЕРВАЕДА

(Пісьмо ваеннаслужачага)

У калгасе імя Кірава, Межаўскага сельсовета, Аршанскага раёна, творацца абураючыя агіднасці, парушаецца статут сельскагаспадарчай арцелі і Сталінская Канстытуцыя. Тут знайшлі сабе месца зладзеі і п'яніцы, якія распяваюць соцыялістычную маёмасць, тэрарызуюць калгаснікаў, разбураюць калгас.

Вось факты. Старшыня калгаса Дзерваед падабраў праўленне са «сваіх» людзей, з якімі ён кожны дзень п'янствуе і раскрадае калгаснае дабро, не лічачыся з масамі калгаснікаў. Быў такі выпадак. Кладаўшчык калгаса Богадзевіч і старшыня пасля п'янкі ноччу пайшлі ў калгасны свіран і насыпалі ў мяшкі мукі. Калі аб гэтым даведаліся калгаснікі, Дзерваед заявіў: «Я — гаспадар гэтага калгаса. Ваша справа, як радавых калгаснікаў, працаваць больш, а сачыць менш».

Месяц назад брыгадзір калгаса Унучкін развозіў калгаснікам бульбу. Даве скрыні бульбы ён прадаў калгаснікам Кучынскаму і Хлусевічу, а грошы прысвоіў сабе.

У мінулым годзе калгас панёс вяліжія страты. На полі асталося няўбраным 40 гектараў ячменю. І гэта ўсё выключна па віне старшыні калгаса.

Адпойчы калгаснік Максіменка ў канцы рабочага дня зайшоў у праўленне запытаць колькі яму запісана працадзён. Пачуўшы гэта, п'яны старшыня аблаяў калгасніка, схапіў за грудзі і парваў на ім сарочку. Калгаснікі не далі злачынцу збіць ні ў чым не вінаватага Максіменка.

Пабоі калгаснікаў старшынёй увайшлі ў сістэму. Такі-ж выпадак здарыўся з калгаснікам Жэнеўскім. Дзерваед і брыгадзір Унучкін на кожным кроку пагражаюць калгаснікам, здзекваюцца над імі.

Калгаснікі пісалі аб гэтых фактах пракурору Аршанскага раёна. Пракурор даручыў расследаваць справу ўчастковаму міліцыянеру Кузнечыку. Участковы міліцыянер выехаў у калгас, выпіў у старшыні і адказаў пракурору: «Такіх выпадкаў не было. Дзерваед на гэта нездольны». Пракурор паверыў Кузнечыку і справа на гэтым закончана.

Ці ведае аб гэтых фактах аршанскі райземаддзел? Ведае! Калгаснікі неаднаразова пісалі і загадчыку райземаддзела і старшыні Межаўскага сельсовета. Але ніхто не прыцягнуў Дзерваеда да адказнасці.

МАКСІМЕНКА.

І. АЛЕКСАНДРАЎ

ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ У ЯПОНІІ

Японская ваеншчына носіцца, як вядо- ма, вельмі шырокімі планамі. Ёй неда- ова захват Манчжурыі і раду іншых ў Кітая. У якасці праграмы-мінімум ая ваеншчына высоўвае задачу за- ння Азіі. Яе праграма-максімум звы- а амаль што да заваявання ўсяго све- ле пакуль што японскія генералы не ць заяўляць нават давер'я свайго ага народу.

ихтуючыся да самурайскіх подвігаў у тным маштабе, яны папярпелі адчу- ае паражэнне ў сябе дома, у самой ыі.

ля прэм'ера генерала Хаясі ваен- на распусціла японскі парламент. Ёй падабалася, што шматлікія дэпутаты мента праяўлялі вядомую нязгоду з маемымі ваеннымі коламі авантурамі. кія генералы жадалі-б бачыць пар- такой-жа паслухмянай марыянет- у сваіх руках, якою з'яўляецца ўрад ала Хаясі.

ж тым, прычыны нязгоды многіх дэ- таў японскага парламента з палітыкай елай ваеншчыны даволі глыбокія. У е распе абурэнне палітыкай ваенных гур, ажыццяўляемай урадам Хаясі і палітэтам, які стаіць за яго спіной. скаму народу быў абяцан «земны пасля пакарэння Манчжурыі. Але ужо шмат год, як Манчжурыя захва- а становішча прапоўных мас Японіі вішча ўсё больш нязносным.

японскай вёсцы голад з'яўляецца ны гаспём. У радзе раёнаў сяляне з на год харчуюцца драўлянай карою, мі, карэннямі. Продаж сялянскіх да- у гарадскія дамы распусты — шы- пашыраная з'ява ў японскай вёсцы. шчыкі, ліхвяры, зборшчыкі палаткаў аюць ільвіную долю ўраджаю сялян- зямель.

е лепш жывецца ў Японіі рабочым. ма, што японскія экспарцёры выцяс- ць з суседніх рынкаў сваіх канку- аў выключна ў рэзультаце лютай эк- атацыі на фабрыках і заводах Япо- ніі. Нямнога рысу, некалькі капеек у дзень, пыноўка ў рабочай казарме — такі лёс японскага пролетарыята.

Як рабочым, так і значным слаям дробнай буржуазіі даводзіцца многа пярпець ад росту дарагоўлі: вынік узмоцненай падрыхтоўкі да вайны.

У краіне расце незадаволенасць. Нават буржуазным партыям прыходзіцца лічыцца з гэтымі настроямі шырокіх мас і адпавелна трымаць сябе ў парламенце. Але з гэтым не жадае лічыцца фашысцкая ваеншчына. Бадай, нават фашыствуючыя генералы не спадзяваліся, што выбаршчыкі стануць галасаваць за іх стаўленікаў з асаблівым энтузіязмам. Аднак, яны ўсё-ж разлічвалі, што з дапамогаю выпрабаваных трукаў ім удасца скласці парламент-марыянетку або, ва ўсякім выпадку, павялічыць у ім колькасць сваіх прыхільнікаў.

Справа ў тым, што японская канстытуцыя дае шырокія магчымасці для фальсіфікацыі выбараў. Ад удзелу ў выбарах адхілены жанчыны. Мужчыны могуць выбіраць толькі з 25-гадовага ўзросту, пры ўмове, калі яны жывуць у данай мясцовасці не менш года. Салдаты і студэнты пазбаўлены права выбіраць і быць выбранымі. У выніку — у выбарах маглі прыняць удзел толькі 14.618 тысяч чалавек, з 70-мільённага насельніцтва краіны.

Кожны выбаршчык значыцца ў спісах паліцэйскіх органаў. У перадвыбарчы перыяд і ў часе саміх выбараў ён падвяргаецца неаслабнаму націску з боку паліцыі. Яго прабуюць задобрыць—нярэдка пры дапамозе хабараў. Калі гэта не дапамагае, паліцыя ўжывае прыёмы люцейшага тэрора.

Нядзіўна, што ўрад Хаясі пры гэтых умовах мог мець вядомыя надзеі на спрыяючы для яго вынік выбараў.

І ўсё-ж, з першых-жа крокаў выбарчай кампаніі ўрад генерала Хаясі чакалі значныя непрыемнасці. Перш за ўсё, урад парушыў выступіць з паднятым забралам, стварыўшы ўласную партыю для ўдзелу ў выбарах. Гэта ідэя сустрэла вельмі адмоўны прыём у японскай грамадскасці. На сходах, мітынгах, у газетах, — усюды можна было пачуць пратэсты супроць стварэння новай урадавай партыі. Толькі вельмі нямногія выказваліся за яе. Нават паліцэйскія данясэнні, адлюстроўваючы настроі выбаршчыкаў, канстатавалі зусім аднадушна, што ўрадавая партыя не можа разлічваць на поспех. Ураду Хаясі прышлося адмовіцца ад сваёй запеі—яго партыя памёрла, не паспеўшы нарадзіцца.

Тады ўрад рашыў палтрымаць на выбарах поўфашысцкія партыі Какумін Домэй і Сіовакай (першая з іх мела ў старым парламенце 15 дэпутатаў, другая — 20). Усе намаганні ўлад былі накіраваны на тое, каб праваліць на выбарах тых дэпутатаў старога парламента, якія асмельваліся выступаць супроць мерапрыемстваў ваеншчыны.

Вынік выбараў паказаў, што ўрад Хаясі атрымаў поўнае паражэнне. Партыя Сіовакай, якая адкрыта падтрымлівала ўрад, не гледзячы на ўсе намаганні мясцовых улад, не толькі не павялічыла колькасці сваіх дэпутатаў у парламенце, але нават страціла алзін дэпутацкі мандат (у новым парламенце гэта партыя будзе мець 19 месц). Яшчэ больш дэпутацкіх мандатаў страціла партыя Кокумін Домэй: у новым парламенце яна мае толькі 11 месц. Яе паражэнне асабліва характэрна ў сувязі з тым, што гэта партыя ішла на выбары з праграмай правядзення раду мерапрыемстваў у духу германскага фашызма. Так, напрыклад, яна выказалася за шырокае ўжыванне стэрылізацыі насельніцтва ў мэтах «аздараўлення нацыі». Праваліласа на выбарах нямала і такіх канцыдатаў іншых партый, якія былі вядомы сваімі прыязнымі адносінамі да ўрада Хаясі. Наадварот, у парламент прайшлі ўсе тыя дэпутаты мінулага складу, якія выступалі асабліва рэзка супроць свавольстваў ваеншчыны: Одзакі, Хамада, Сайто і іншыя.

Больш чым хто дэпутатаў мае ў новым парламенце, як і ў старым, партыя Мінсейто. Гэта — партыя буйнай буржуазіі і памешчыкаў. За яе спіною стаіць магутны капіталістычны канцэрн Міцубісі. Аднак, Мінсейто вядома сваёй асцярожнай палітыкай: перш чым упягнуць Японію ў «вялікую вайну», яна хацела-б правесці старанную падрыхтоўку да яе. У адпаведнасці з гэтым, Мінсейто не спачувае некаторым небяспечным авантурам ваеншчыны. Улічваючы настроі выбаршчыкаў, Мінсейто высунула на выбарах лозунг «звяржэнне ўрала Хаясі». Хоць гэта партыя страціла 26 месц, яна ўсё-ж мае 179 парламенцкіх мандатаў.

Наступнаю на свайму ўплыву парламенцкай партыяй з'яўляецца Сейюкай. Гэта партыя асабліва цесна звязана з той часткай буржуазіі і памешчыкаў, якая зацікаўлена ў новых зямельных захватах. І ўсё-ж, правільна ўлічваючы настроі шырокіх мас насельніцтва, партыя Сейюкай крытыкуе ўрад Хаясі, а на выбары пайшла пад лозунгам «абарона канстытуцыйнага рэжыма». Значная частка выбаршчыкаў, занепакоеных фашысцкай агітацыяй за скасаванне канстытуцыі і ліквідацыю парламэнта, аддала свае галасы кандыдатам партыі Сейюкай. Выйграўшы адно месца ў парламенце, партыя Сейюкай стала ўладальніцай 175 парламенцкіх мандатаў.

Асабліва вялікага поспеху дабілася на выбарах партыя Сякай Тайсюто, якая павялічыла колькасць сваіх дэпутацкіх мандатаў з 18 да 37. Гэта — партыя японскіх соцыял-дэмакратаў. Яна не адзначаецца ні чоткай праграмай, ні паслядоўнай класавай палітыкай. І ўсё-ж, рабочыя і сяляне Японіі спачуваюць многім лозунгам гэтай партыі. Сякай Тайсюто ішла на выбары пад лозунгам «барацьбы з фашысцкімі тэнэнцыямі». Многія рабоча-сялянскія выбаршчыкі з гатоўнасцю галасавалі за гэты лозунг.

У асаблівым становішчы аказалася партыя Ніхон Мусанта (пролетарская партыя Японіі). Гэта партыя аказалася ў 1936 годзе ад Сякай Тайсюто. Яна з'яўляецца прыхільніцай алзінага антыфашысцкага фронта і ў кароткі тэрмін здолела заваяваць вялікі ўплыў у рабочых і сялянскіх масах. Аднак, матэрыяльныя сродкі гэтай маладой пролетарскай партыі дазволілі ёй высунуць на выбарах толькі чатырох дэпутатаў, з якіх алзін аказаўся выбраным у парламент. Выбарчы лозунг Ніхон Мусанто гаварыў: «Далоў фашызм! Абарона парламентарызма!».

Пераважная большасць новага японскага парламента выбрана пад лозунгамі, накіраванымі супроць урада генерала Хаясі. З 466 дэпутатаў парламента звыш 400 знаходзіцца ў апазіцыі да ўрада і толькі каля 40 падтрымліваюць яго. Знамянальныя суадносіны сіл!

Больш дзевяці дзесятых японскіх выбаршчыкаў аддала свае галасы за мір, супроць ваенных авантур, супроць германа-японскага ваеннага саюза, супроць далейшай фашызацыі краіны.

Надзеі ўрада Хаясі сфармаваць у рэзультаце выбараў «паслухмяны» парламэнт пацярпелі поўны крах. Роспуск старога парламента і выбары новага не прынеслі ўраду генерала Хаясі нічога, апрача канфуза.

Якія-ж далейшыя планы і намеры ўрада Хаясі?

Частка японскіх газет выказвала мэркаванне, што правал на выбарах вымусіць урад падаць у адстаўку. Але лёс цяперашняга японскага ўрада рашаюць не выбаршчыкі, а ваенныя колы, кіруючыя кожным рухам міністраў. Міністры атрымалі загад ваеншчыны: рабіць добрую міну пры дрэннай гульні і аставацца на сваіх пастах. У адпаведнасці з гэтай устаноўкай дэкларацыя японскага ўрада пасля выбараў была вытрымана ў такіх тонах, быццам нічога істотнага наогул не адбылося. Урад старанна прамаўчаў у дэкларацыі аб сваім правале, абмежаваўшыся беззмястоўнай балбатнёй. Ён выразіў упэўненасць, што новыя члены парламента «будуць кіравацца духам самаафяравання і імкнуцца апраўдаць надзеі, узвялічваючы ідэалы, якія ляжаць у аснове імперыі».

Згодна японскім законам, урад абавязан склікаць новы парламент не пазней, чым праз 5 месяцаў пасля роспуску папярэдняга. Значыць, урад можа адцягнуць склікание парламента да 31 жніўня. Тэрмін— дастатковы для таго, каб паставіць японскі народ перад рознымі нечаканасцямі. Але і пасля склікання парламента становішча далёка не будзе ясным.

Ва ўралавых колах раздаюцца ўжо зараз галасы за разгон новага парламента. Не выключана магчымасць, што новаму японскаму парламенту прыдзецца пайсці следам за старым. Гэта дало-б ваеншчыне далейшую перадышку для бескантрольнага ажыццяўлення яе палітыкі і паслужыла-б пераходам да поўнай ліквідацыі парламента і канчатковай фашызацыі краіны. Некаторыя прыхільнікі такога курсу носяцца з думкаю аб тым, каб перад паўторным роспускам парламента працягнуць у ім закон аб унясенні істотных змен у канстытуцыю. Згодна іх праекту, наступныя парламенцкія выбары мяркуецца абставіць яшчэ большымі абмежаваннямі. Ахвотней усяго яны зрабілі-б японскі парламэнт дакладнай копіяй германскага фашысцкага рэйхстага, — з тою толькі розніцаю, што замест праславутага «хейль» дэпутаты крычалі-б «банзай».

Пасля выбараў ва ўрадавых колах зноў ажывіліся гутаркі аб стварэнні новай урадавай партыі. Вядома, што прадстаўнікі ўрада вядуць аб гэтым перагаворы з радам палітычных дзеячоў. Палітыканы ўзмоцнена прабуюць удыхнуць жыццё ў гэты мёртванароджаны праект. Падобныя праекты сведчаць аб тым, з якою настойлівасцю фашысцкая ваеншчына імкнецца да канчатковай фашызацыі Японіі ў імя паскарэння падрыхтоўкі да «вялікай вайны».

Не выключана, вядома, і тая магчымасць, што ваеншчына ў сучасны момант знойдзе больш выгодным адмовіцца ад падтрымання ўрала Хаясі, які аскандаліўся на выбарах, каб дзейнічаць іншымі метадамі. Тады ўрад будзе вымушан пакінуць палітычную арэну, бо ваенныя колы з'яўляюцца яго адзінай палтрымкай. Недарма японская газета «Асахі» писала: «Паколькі ўрад Хаясі з усіх бакоў акружан ворагамі, уся ўвага палітычных колаў сканцэнтравана на пазіцыі ваенных улад, якія трымаюць у сваіх руках лёс кабінета». Адным з манеўраў ваеншчыны з'яўляюцца перагаворы з Англіяй аб падзеле Кітая, перагаворы, якія маюць мэтаю ўмацаваць глебу пад нагамі.

Які-б шлях ні выбрала японская ваеншчына, вынік парламенцкіх выбараў паказаў, што яе палітыка сустракае ўсё большае процідзеянне шырокіх мас японскага насельніцтва. Аб гэтым-жа сведчыць і растучы рух японскіх прапоўных у карысць народнага фронта, а таксама шматлікія стачкі, якія патрасаюць прамысловыя цэнтры краіны.

Становішча тылу японскага імперыялізма далёка не спрыяе ваенным авантурам. І калі ваеншчына, не гледзячы на гэта, усё-ж адважыцца штурхнуць Японію на «вялікую вайну», то ёй прыдзецца за гэта жорстка паплаціцца.

ЗА РУБЯЖОМ

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Мяцежнікі і інтэрвенты, якія атрымліваюць усё новыя падмацаванні, па-ранейшаму прадпрымаюць безупынныя атакі на рэспубліканскія пазіцыі. У апошнія дні лютыя баі адбываліся на гары Сольюва (на паўночны ўсход ад Більбао), дзе мяцежнікі і італьянская брыгада «чорныя стрэлы», панёсшыя цяжкія страты, вымушаны былі адступіць. 14 мая фашысты, перагрупаваўшы свае сілы, прадпрынялі— пры падтрымцы авіяцыі, морскага флота і механізаваных і матарызаваных часцей— лютыя атакі ў раёнах Бакіо і гары Хата (на паўночны захад ад гары Сольюва) і ў раёне Арыэта (на поўдзень ад Сольюва). Аперацыя была разлічана на акружэнне ўрадавых войск і на занятце Сольюва і горада Мунгія (на паўночны ўсход ад Більбао).

Сустрэтыя моцным агнём рэспубліканцаў, фашысты не змаглі ажыццявіць сваіх намераў. Яны панеслі вялікія страты забітымі і ранеными. Авіяцыя інтэрвентаў працаўжае сваю разбуральную работу. Штодзень самалёты фашыстаў скідаюць сотні бомб на мірнае насельніцтва.

14 і 15 мая авіяцыя інтэрвентаў некалькі раз бамбардыравала рабочыя кварталы горада Більбао. Заўважаецца значная канцэнтрацыя італьянскіх войск у сектары Ордунья і Амурыо (на поўдзень ад Більбао).

* * *

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 15 мая. (БЕЛТА). Рад газет прыводзіць даныя, якія сведчаць аб тым, што на біскайскім фронце, апрача германскіх лётчыкаў, б'юцца германскія войскі.

Орган профсаюзаў «Дэйлі Геральд» у перадавым артыкуле ўказвае, што маючыяся факты гавораць аб сістэматычным парушэнні Германіяй пагаднення аб неўмяшанні ў іспанскія справы.

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

Згодна паведамлення англійскіх газет, рэспубліканцы падыходзяць да Таледо (на поўдзень ад Мадрыда) з двух бакоў. На поўдзень ад горада яны занялі важную вышыню, якая панує над Таледо. Захвачана шмат палонных і ваеннага снаряжэння.

БАМБАРДЫРОЎКА ВАЛЕНСІІ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 15 мая (БЕЛТА). Сёння ўвечары самалёт мяцежнікаў скінуў над Валенсіяй некалькі бомб вялікай разбуральнай сілы. Згодна папярэдніх даных, 30 чалавек забіта і 150 ранена. Пашкоджана некалькі будынкаў, у тым ліку будынак англійскага пасольства і французскага консульства.

ЛАРГО КАБАЛЬЕРО ФАРМІРУЕ НОВЫ УРАД

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 15 мая (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе з Валенсіі, што фармаванне новага іспанскага ўрада даручана Ларго Кабальеро.

ЯПОНСКАЯ ГРАМАДСКАСЦЬ ПАТРАБУЕ АДСТАЎКІ ЎРАДА ХАЯСІ

ТОКІО (сталіца Японіі), 15 мая (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Домей Цусін, — сёння на адбыўшайся гутарцы галоўнага сакратара партыі Мінсейто Койдзумі з галоўным сакратаром партыі Сейюкай Мацуна (асноўныя буржуазныя партыі парламента) дасягнута поўная дагаворанасць аб неабходнасці ўзгодненай сумеснай барацьбы абодвух партый за скіданне ўрада Хаясі.

Большасць газет, каментуючы пагадненне Мацуна з Койдзумі, лічыць, што дагаворанасць паміж абодвума партыямі прадвырашае пытанне аб унясенні вотума недавер'я ўраду Хаясі на надзвычайнай сесіі парламента.

ДА НАПАДУ НА АНГЛІЙСКІ МІНАНОСЕЦ

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 15 мая (БЕЛТА). Як перадае агенцтва Фабра, у паведамленні іспанскага міністэрства морскага флота і авіяцыі гаворыцца, што англійскі эскадрэнны мінаносец «Хантэр», пацярпеўшы ўчора аварыю ў сувязі з нападам ваеннага карабля мяцежнікаў, адбуксіраван у Гібралтар англійскім крэйсерам. Англійскі контрадмірал, прыбыўшы ў Альмерыю (порт на поўдні Іспаніі) наведаў рэспубліканскі лінкор «Хаіме-I» і дзякаваў яго камандзіра за дапамогу, аказаную «Хантэру» рэспубліканскім флотам. Паведаны ў справах Англіі нанес візіт іспанскаму міністру морскага флота і авіяцыі Прыето, якому выразіў падзяку за выратаванне англійскага мінаносца і яго каманды.

Трацкісцкія правакатары не сунімаюцца

ВАЛЕНСІЯ, 15 мая. (БЕЛТА). Валенсійскі орган социялістычнай партыі — газета «Адэлантэ» — піша ў перадавым артыкуле, што неабходна пакласці канец злачынным падбухторванням трацкісцкага лістка «Ля Баталья».

Нельга больш цярпець становішча, піша газета, пры якім орган трацкісцкай арганізацыі «ПОУМ», а таксама і іншыя газеты праводзілі-б кампанію, якая мае на мэце пасеяць смуту, выклікаць акты гвалту і, нарэшце, сапсаваць узаемаадносіны паміж антыфашысцкімі партыямі і арганізацыямі.

МІТЫНГ САЛІДАРНАСЦІ З БАСКСКІМ НАРОДАМ

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 15 мая. (БЕЛТА). Адбыўся арганізаваны компартыяй мітынг салідарнасці працоўных Парыжа з баскскім народам. Прысутнічала 20 тысяч чалавек. Выступалі тт. Кашэн, Дзюкло, Вайян Куцюр'е і інш.

Вайян Куцюр'е, расказаўшы аб сваёй паездцы ў Більбао, указаў, што компартыя даручыла яму арганізаваць «камітэт па аказанню дапамогі Більбао». Вайян Куцюр'е паведаміў, што два параходы ўжо грузяцца харчаваннем у Бардо.

У прынятай рэзалюцыі гаворыцца, што 20 тысяч працоўных Парыжа, сабраўшыся на мітынг, вітаюць іспанскі народ і яшчэ раз патрабуюць, каб Ліга нацый дабілася спынення крывавага ашуканства, дазваляючага арміям Гітлера і Мусаліні знішчаць цэлы народ, і прымяніла санкцыі да агрэсара.

Рэзалюцыя заклікае працоўных усяго свету да хутчэйшага ажыццяўлення міжнароднага адзінства дзеянняў у імя абароны Іспанскай рэспублікі, а таксама ў інтарэсах міру і свабоды ўсіх народаў. У заключэнне рэзалюцыя заклікае ўзмацніць рух салідарнасці французскага народу з баскскім народам.

Міжнародная хроніка

⊙ 15 мая раніцой народны камісар замежных спраў СССР т. **Літвінаў** разам з іншымі членамі совецкай дэлегацыі прысутнічаў на развітальным прыёме ў англійскага караля Георга VI у Букінгемскім палацы.

⊙ На Брытанскай імперскай канферэнцыі ў Лондане галава ўрада Аўстраліі (брытанскага дамініёна) Лайонс заявіў, што Аўстралія вітала-б заключэнне **пакта аб ненападзе** паміж ціхаакіянскімі краінамі, складзенага ў духу прынцыпаў Лігі нацый. Усе газеты адзначаюць гэта выступленне аўстралійскага прэм'ера.

⊙ Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе з Данцыга («вольны» горад, які знаходзіцца пад апекай Лігі нацый), што на адбыўшымся там надзвычайным з'ездзе германскай нацыянальнай партыі («Дэйч-нацыонале») прынята рашэнне аб **«самароспуску»** партыі. Як паведамлялася ўжо, германскія фашысты ў Данцыгу загадзя зрабілі папярэджанне як германскай нацыянальнай партыі, так і іншым, аб тым, што ім неабходна «самаліквідавацца».

⊙ **Парыжская міжнародная выстаўка** адкрываецца афіцыяльна 24 мая. 25 мая выстаўка будзе адкрыта для публікі. У той-жа дзень адкрыецца павільён СССР.

⊙ 14 мая ў Венецыю (Італія) прыехаў германскі міністр авіяцыі Герынг.

⊙ 13 мая ў Белградзе (Югаславія) заключан новы югаслаўска-румынскі **гандлёвы дагавор.**

⊙ Закончана **пабудова аўтамагістралі** Нанкін—Юньнань (Кітай). З прычыны неспрыяльнага надвор'я і надзвычай цяжкіх умоў на будаўніцтве дарогі памерла некалькі тысяч рабочых і шмат інжынераў.

⊙ У Дубліне (Ірландыя) **узарвана дынамітам статуя** англійскага караля Георга II. Думаюць, што ўзрыў зроблен ірландскімі рэспубліканцамі, якія напярэдадні ўзрыву дэманстравалі супроць каранацыйных урачыстасцей. Як вядома, Ірландыя афіцыяльна не прымала ўдзелу ў каранацыйных урачыстасцях.

Эвакуацыя дзяцей з Більбао. НА ЗДЫМКУ: баскскія мацеры развітваюцца са сваімі дзецьмі. (СФ).

ЛЯ МАГІЛЫ ДУКОРСКІХ ПАРТЫЗАН

ДУКОРА. (Кар. «Звязды»). Кожны год калгаснікі і калгасніцы, працоўныя аднасобнікі і інтэлігенцыя Смілавіцкага раёна адзначаюць памяць 16 партызан, замучаных і расстрэляных белапалякамі 17 мая 1920 г.

Учора з самай раніцы на магілу дукорскіх партызан пачалі з'язджацца калгаснікі на грузавых машынах, веласіпедах, конях. Да поўдня ля магілы сабралася каля 7 тысяч чалавек. Сярод іх старыя калгаснікі і калгасніцы, сведкі зверскай расправы белапалякаў над партызанамі. Маці камандзіра атрада Блажко Андрэя— Варвара Блажко расказвае піонерам і моладзі аб сваім сыне. Маці хавае крывавую кашулю Андрэя, на якой сляды безліч ран. Яго і астатніх 15 таварышоў зверскі катавалі, але яны не выдалі свайго атрада і на магілу ішлі са спевам «Інтэрнацыянала».

Над магілай у жалобе схіліліся чырвоныя з крэпам сцягі. На вялікую магілу паклалі вянкі з майскай зелені. Старшыня Смілавіцкага РВК т. Жуковіч адкрывае жалобны мітынг, прысвечаны 17 гадавіне з дня расстрэлу дукорскіх партызан. Удзельнік партызанскага атрада тав. Страх расказвае, як дукорскія партызаны разам са слаўнай Чырвонай Арміяй у першыя гады совецкай улады змагаліся за справу вялікай социялістычнай рэволюцыі. Ён успамінае аб памятным дні 17 мая 1920 года, калі пралілася кроў 16 партызан.

— Як радасна ведаць, — гаворыць з трыбуны сакратар ЦВК БССР тав. Ляўкоў,—што кроў, пралітая нашымі людзьмі, не прапала даремна. Мы прышлі на гэту магілу пераможцамі.

Выступаюць з прамовай сакратар РК КП(б)Б тав. Бланштэйн, старшыня Дукорскага сельсовета тав. Каплан, школьнік — піонер Шычка. Яны гавораць аб грандыёзных перамогах социялізма ў Совецкай краіне за 20 год Вялікай Социялістычнай рэволюцыі, аб бязмежнай любві да сваёй бацькаўшчыны, аб гатоўнасці кожную мінуту стаць на абарону краіны социялізма ад ворагаў. Над магілай 16 партызан працоўныя Смілавіцкага раёна яшчэ раз запэўнілі вялікую комуністычную партыю ў сваёй гатоўнасці да абароны Совецкага Саюза, што яны будуць яшчэ больш узмацняць класавую пільнасць да ворагаў народа — трацкістаў і правых — агентаў міжнароднага фашызма.

Над магілай партызан доўга несліся крыкі «ура» і гукі аркестраў пераможнаў социялізма, за справу якога ад зверскай рукі белапалякаў 17 год назад ляглі 16 гераічных партызан.

А. ЛОСЬ.

РОСТ УКЛАДАЎ

У першым квартале г. г. план па ўкладах перавыканалі наступныя райашчадкасы: Суражскага раёна — на 152,2 проц., Прапойскага — на 145,8 проц., Свяцілавіцкага — на 103,8 проц. За адзін месяц другога квартала план па ўкладах выканалі наступныя раёны: Уздзенскі — выканаў квартальны план на 66,7 проц., Капыльскі — на 34 проц.

ПАПРАУКА

У артыкуле Я. Гінзбурга **«Нізкая якасць партыйнай прапаганды»**, змешчаным у «Звязде» за 16 мая, па віне друкарні выпаў радок.

Другі абзац трацяй калонкі трэба чытаць:

«У слабай падрыхтаванасці нашых прапагандыстаў, у тым, што кіраўнікі школ і гурткоў па гісторыі партыі часта не ўмеюць правільна растлумачыць важнейшыя палажэнні Леніна — Сталіна, — віноўны, безумоўна, гарадскі камітэт партыі ў цэлым і, у першую чаргу, аддзел культуры і прапаганды гаркома».

15 мая вярнуліся з-за граніцы совецкія скрыпачы — пераможцы міжнароднага конкурса скрыпачоў імя Ізаі. Разам з імі прыехалі член журы конкурса праф. Ямпольскі і піяніст Дзякаў.

НА ЗДЫМКУ: злева направа — Буся Гольдштэйн, піяніст Дзякаў, Міша Фікстэнгольц, Марына Казалупава, Давід Ойстрах, Ліза Гілельс і праф. Ямпольскі на станцыі Негарэлае.

Фото Прывальскага (БСФ).

ПЕРШЫЯ ДНІ ЛАГЕРНАГА ЖЫЦЦЯ

Прыгожая майская раніца. На гарызонце, там, дзе густы лес упіраецца сваімі верхавінамі ў блакітнае яснае неба, паказалася сонца. Калі гадзіннік пакажа 9 гадзін, уся пляцоўка, акружаная з усіх бакоў высокім сасновым борам, дзе размясціўся лагер часці, якой камандуе палкоўнік Вестфаль, зальецца шчодрымі праменнямі майскага сонца.

Быццам па камандзе ўздоўж дарожкі, абсаджанай з абодвух бакоў кветкамі, выстраіліся ў рад палаткі. Утульна размясціліся ў іх байцы. У палатках—драўляныя падлогі і добрыя ложкі. Навакол палатак байцы пасадзілі кветкі. Хутка тут зацвітуць высокія вяргіні, чырвоная гваздзіка, анюціны вочкі, усяго — 22 гатункі кветак.

Крыху воддаль — у цэню дрэў расстаўлены сталы і лавы для заняткаў. Нямнога далей, у прыгожым месцы размешчан ленкуток. Байцы любоўна і беражна абсталявалі яго. У вольныя ад заняткаў гадзіны яны змогуць тут адпачыць, пачытаць газеты, літаратуру. Вялікая частка ленкутка афармлена на тэму: «Канстытуцыя СССР». Тут ёсць неабходныя матэрыялы на лютаўскаму Пленуму ЦК ВКП(б), даклад і заключнае слова таварыша Сталіна.

Яшчэ будучы на зімніх кватэрах, байцы дакладна вывучалі даклад правадыра, але і тут, у лагерах, яны яшчэ і яшчэ раз уважліва яго прачытваюць, вывучаюць матэрыялы Пленума. Даклад і заключнае слова таварыша Сталіна яшчэ больш натхняе байцоў на лепшае засваенне баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Падвядзенне вынікаў зімовай вучобы паказала, што байцы і камандзіры добра выканалі план баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Артылерысты добра ведаюць тэхніку сваёй прафесіі.

Зараз 5 гадзін 30 мінут раніцы. Ля цэнтра лагера прайшоў гарніст і зайграў раніцнюю зору. Хутка з палаток выскакваллі байцы. Дзнявальныя абвяшчаюць пастраенне на раніцнюю фіззарадку.

Пачаўся працоўны рабочы дзень.

ІЗЯ БАС.

ВЫКЛЮЧНЫЯ КАНЦЭРТЫ

15 і 16 мая ў клубе імя Сталіна адбыліся канцэрты прыехаўшых у Менск народнай артысткі СССР ордэнаноскі Марыі Іванаўны Літвіненка-Вольгемут і народнага артыста УССР ордэнаносца Івана Сергеевіча Патаржынскага. Глядачы надзвычай цёпла сустрэлі артыстаў-ордэнаносцаў, лепшых прадстаўнікоў тэатральнага мастацтва брацкага украінскага народу.

Яны прадэманстравалі выключнае майстэрства песеннай музыкальнай культуры квітнеючай Украіны і свае здольнасці, якія так высока ацэнены совецкім урадам. У першым аддзяленні канцэрта народныя артысты з вялікім майстэрствам выканалі добра знаёмыя шырокім працоўным масам украінскія народныя песні, урыўкі з опер «Тарас Бульба», «Запарожац за Дунаем» і інш. Асабліва запамінаюцца песні «Чого вода...», «Ой, не світы, місяченьку», «Віють вітри» ў выкананні М. І. Літвіненка-Вольгемут і песні «Ой кум до кумы», «Пісня о пане Саливоне» і інш. у выкананні І. С. Патаржынскага.

Аб высокай культуры народных артыстаў сведчыць і тое, што ў другім аддзяленні канцэрта яны захапляюча выконвалі лепшыя творы рускай музыкальнай класікі. М. І. Літвіненка-Вольгемут і І. С. Патаржынскі выконвалі ўрыўкі з опер «Пікавая дама», «Русалка», «Алеко» і інш.

Пасля кожнага выступлення глядачы ўзнагароджвалі народных артыстаў доўга незмаўкаючымі апладысментамі, выклікалі на біс і доўга не адпускалі са сцэны.

У чым-жа каштоўнасць канцэртаў М. І. Літвіненка-Вольгемут і І. С. Патаржынскага?

Працоўныя Менска пазнаёміліся з лепшымі ўзорамі украінскага мастацтва. Поруч імі артысты прадэманстравалі багацце і яркасць народных песень. У гэтых адносінах многа трэба вучыцца нашым артыстам. На самай справе. У нас апрача заслужанай артысткі рэспублікі Л. І. Александроўскай ніхто больш сур'ёзна і працуе над народнай песняй, не вывучае багацці і хараство.

Трэба ўсямерна вітаць ініцыятыву Беларускай дзяржаўнай філармоніі, якая арганізавала канцэрты лепшых прадстаўнікоў мастацтва СССР. Такія мерапрыемствы трэба паўтараць.

Сёння М. І. Літвіненка-Вольгемут і І. С. Патаржынскі ад'язджаюць на сваю радзіму. Шчаслівага шляху дарагім госцям!

К. Г.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

Аддзел кіруючых парторганаў ЦК КП(б)Б выклікае на 25 мая (пакой 55) ніжэйпералічаных таварышоў:

Песляк В. І., Фінкель М. І. (Варашылаўгоррайком); Бокун М. М. (Сталінскі горком); Звякаў І. С. (Свяцілавічы); Эльвін Г. Я. (Полацк); Жарко П. Г. (Чэрвень); Хакін Н. Б. (Рагачоў); Міхалевіч А. І. (Мозыр); Праваловіч А. С. (Бабруйск); Драпаў Н. (Лельчыцы); Сущкевер О. Г. (Пухавічы); Ольшэўскі П. К. (Дрыса); Круглоў В. (Глуск); Пілішенка П. А. (Касцюковічы); Зайковіч І. С. (Сураж); Крыштапаліс А. Г. (Чэрвень); Ленішэўская А. Г. (Лепель); Матэвіч В. І. (Вягомль).

Заг. АКПО ЦК КП(б)Б РУБІНШТЭЙН.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Нарада прапагандыстаў, сакратароў парткомаў і парторгаў Кагановіцкага раёна па пытанню аб пісьме таварыша Сталіна наконт падручніка па гісторыі ВКП(б) і аб задачах партыйнай прапаганды адбудзецца 19 мая ў 7 гадз. вечара ў памяшканні Дома тэхнікі (Комсамольская, 25).

Сталінскі РК КП(б)Б просіць з'явіцца тав. Шэрмана С., раней працаваўшага на заводзе імя Кірава, у Сталінскі РК КП(б)Б (Чырвонаармейская, 16, пакой № 20).

Згублен партбілет узору 1936 г. за № 0875474, выданы Прапойскім РК КП(б)Б на імя Назарчука Несцера Афанасьевіча. Лічыць несапраўдным.

Сакратар РК КП(б)Б РУМЯНЦАЎ.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО:

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР (БДДТ)
17 мая Абан. № 110.
СКУПЫ

Памяшк. Дзярж. Яўрейск. тэатра | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
17 мая Абан. № 40.
ЕЎГЕНІЙ ОНЕГІН

Гукавы кінотэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» ДЗЯЎЧЫНА З КАМЧАТКІ

Гукавы кінотэатр «Пролетарый» КРЫЛАТЫ МАЛЯР

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал» НАТАЛКА-ПАЛТАЎКА

Гукавы кінотэатр «Спартак» ЛЕДЗЯНЫ ДОМ (нямы варыянт)

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 18 МАЯ:

8.30 — «Апошнія паведамленні». 10.30 — канцэрт па заяўках дзяцей. 16 — канцэрт па заяўках радыёслухачоў. 18.15 — міжнародны агляд. 18.30 — канцэрт. 19 — літаратурная перадача. 19.30 — трансляцыя канцэрта з Кіева. 21 — канцэрт з Дома Чырвонай Арміі арты. ста Жадан.

РАСШУКВАЮ брата Маркава Хвядоса, які 19 красавіка г. г. паехаў у Менск і не вярнуўся. Узрост 18 год, глухаманым, сярэдняга росту. Ведаючых аб месцапрабыванні прашу паведаміць па адрасу: Клічаўскі раён, Бацвіцкі сельсавет, калгас «Большэвік», Маркаву Раману.

19 МАЯ, У 7 ГАДЗІН ВЕЧАРА, У ПАМЯШКАННІ КЛУБА імя СТАЛІНА (рог Комсамольскай і Інтэрнацыянальнай)

адбудзецца пасяджэнне пленума Менскага гарадскога совета рабочых, селянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.

ПАРАДАК ДНЯ:
ЗАЦВЕРДЖАННЕ ГЕНЕРАЛЬНАГА ПЛАНА РЭКАНСТРУКЦЫІ г. МЕНСКА
(дакладчык тав. ЖУКОВІЧ).

ЗАПРАШАЛЬНЫЯ БІЛЕТЫ НА ПЛЕНУМ МОЖНА АТРЫМАЦЬ У ГОРСОВЕЦЕ (пакой 49, 3 паверх).

ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

ПЛАНАВА-ФІНАНСАВЫ АДДЗЕЛ НКЗ БССР

даводзіць да ведама райза, МТС, РКШ і інш. арганізацый, што

ЗАБЯСПЕЧАННЕ кнігамі і бланкамі калгаснай дакументацыі ўсіх калгасаў БССР

на падставе пастановы СНК СССР № 2050 ад 11 верасня 1935 г. і распараджэння Наркамзема СССР № 205/32 ад 3 лістапада 1936 г.,

ПЕРАДАНА Беларускаму аддзяленню „СОЮЗОРГУЧЕТ".

У сувязі з гэтым спецыяльны рахунак Наркамзема па разліках з райза, МТС, РКШ за гэту дакументацыю з 1 чэрвеня г. г. закрываецца.

Усе прэтэнзіі па разліках за кнігі і бланкі калгаснай дакументацыі будуць прымацца да 1 чэрвеня 1937 г. Пасля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі па ўзаемных разліках прымацца не будуць.

Планава-фінансавы аддзел НКЗ БССР.

ГОРАЦКІ ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАЛЬНЫ ТЭХНІКУМ

абвяшчае КОНКУРС

на замяшчэнне пасад выкладчыкаў з новага вучэбнага 1937—38 года наступных дысцыплін:

1. Па беларускай мове і літаратуры — 1 выкладчык
2. Па рускай мове і літаратуры — 1 выкладчык
3. Па матэматыцы — 1 выкладчык.
4. Па фізіцы — 1 выкладчык
5. Па землеўпарадкавальнаму праектаванню — 2 выкладчыкі
6. Па земляробству, расліваводству — 1 выкладчык
7. Па нямецкай мове — 1 выкладчык
8. Па фізвыху — 1 інструктар.

Жадаючыя заняць пасады выкладчыкаў па вышэйуказаных дысцыплінах у тэхнікуме, павінны прадставіць тэхнікуму дакументы: аб адукацыі, даведку аб апошнім месцы работы, аўтабіяграфію.

Дакументы прысылаць па адрасу: БССР, г. Горкі, землеўпарадкавальны тэхнікум, дырэктару.

Умовы аплаты згодна пастановы СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб павышэнні заработнай платы педперсаналу тэхнікумаў, рабфакаў і інш. ад лютага 1937 года.

ДЫРЭКЦЫЯ

Збірайце і здавайце металічны лом

„МЕТАЛЛОМУ"!

У КОЖНЫМ ПРАДПРЫЕМСТВЕ, СОЎГАСЕ, МТС, МТМ, НА КАЛГАСНЫМ ДВАРЫ, У САРАЯХ, ДВАРАХ, ВЫШКАХ, КУЗНЯХ І МАЙСТЭРНЯХ ЛЯЖАЦЬ НЕПАТРЭБНЫЯ, ПРЫШОЎШЫЯ Ў НЯГОДНАСЦЬ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫ ІНВЕНТАР І МЕТАЛІЧНЫЯ ПРАДМЕТЫ ХАТНЯГА ЎЖЫТКУ.

МЕТАЛІЧНЫ ЛОМ ПАТРЭБЕН ЗАВОДАМ ЧОРНАЙ МЕТАЛУРГІІ ДЛЯ ВЫПЛАЎКІ СТАЛІ.

ГАНАРОВЫ АБАВЯЗАК КОЖНАГА ГРАМАДЗЯНІНА СОВЕЦКАГА САЮЗА — АКТЫЎНА ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ Ў ЗБОРЫ І ЗДАЧЫ МЕТАЛІЧНАГА ЛОМУ.

АЧЫШЧАЙЦЕ ТЭРЫТОРЫІ ДВАРОЎ І МАЙСТЭРАНЬ АД ЛОМУ, ЗБІРАЙЦЕ ЯГО І ЗДАВАЙЦЕ НА ПАТРЭБЫ НАШАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ.

НІ АДЗІН КІЛОГРАМ МЕТАЛІЧНАГА ЛОМУ НЕ ПАВІНЕН АСТАЦЦА НЕСКАРЫСТАНЫМ

Арганізуйце ўзмоцненую **ВЫВАЗКУ** падрыхтаванага металічнага лому к пагрузачным пунктам чыгункі, прадастаўляючы свой аўтагужавы транспарт, папярэдне ўзгадніўшы пытанне з агентамі «Металлома».

Лом чорных металаў манапольна загатаўляе **УСЕСАЮЗНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТРЭСТ «МЕТАЛЛОМ»** ва ўсіх мясцовасцях праз свой філіялы-заготавіцельны апарат і ПЛЯЦОЎКІ «МЕТАЛЛОМА», якія знаходзяцца ў наступных гарадах БССР:

МЕНСК, 2-я Навалачная
ВІЦЕБСК, Арлоўская, № 31-а
ГОМЕЛЬ, Гарэлае Балота
МАГІЛЕЎ, Першамайская вул., чыг. пераезд
БАБРУЙСК, Шасейная вул.
ОРША, Васточная
РЭЧЫЦА, Тупік, 12.

Пры прыёмцы лому агенты абавязаны выдаваць усім акты ў адным экземпляры.

У гэтых актах абавязкова ўказваюцца рэквізіты ломаздатчыкаў, а іменна: поўная назва ломаздатчыкаў: а) крэдытная ўстанова, у якой знаходзіцца разліковы рахунак у банку, нумар яго; б) калі ломаздатчык з'яўляецца прыватнай асобай, яго прозвішча, імя і імя па бацьку і дакладны адрас.

Разлікі за зданы металічны лом праводзяцца па прад'яўленых рахунках, з абавязковым прыкладаннем **прыёма-здатачных актаў** або непасрэдна па гэтых актах, не агентурай, а **выключна Менскай канторай «Металлом»**, якая знаходзіцца ў г. Менску, Рэволюцыйная, 3. Тэл. № 21-920. Разліковы рахунак 40015 у менскім аддзяленні Дзяржбанка.

«МЕТАЛЛОМ» АПЛАЧВАЕ за лом па наступных цэнах:

жалеза-стальны лом—30 р. за тону
дахавае — 6 руб. за тону
чыгун негарэлы — 50 р. за тону
чыгун гарэлы — 25 руб. за тону

ЗА ДАСТАЎКУ лому на ПЛЯЦОЎКУ «Металлома» або на чыгуначную станцыю **СВАІМ ТРАНСПАРТАМ** ломаздатчыкі атрымліваюць за перавозку па цэнах, устаноўленых СНК.

МЕНСКАЯ КАНТОРА «МЕТАЛЛОМ».

19 мая ў 2 гадзіны дня, у канферэнцзале Акадэміі навук БССР

С. М. ЯКУБЧЫК публічна абараняе ДЫСЕРТАЦЫЮ

на ступень кандыдата гістарычных навук на тэму: «Рабочы рух у Беларусі ў 2-й палове XIX стагоддзя».

У 8 гадзін 30 мінут вечара

Л. М. ГАЛАМШТОК публічна абараняе ДЫСЕРТАЦЫЮ

на ступень кандыдата гістарычных навук на тэму: «Кагалы, як сродак эксплуатацыі яўрэяў у першай палове XIX стагоддзя ў Беларусі».

Апаненты: доктар гістарычных навук С. Х. Агурскі і кандыдат гістарычных навук Я. Г. Рубін.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА ГІСТОРЫІ.

20 мая ў пасяджэнні вучонага совета Беларускага сельскагаспадарчага інстытута (Горы-Горкі) адбудзецца

публічная абарона ДЫСЕРТАЦЫІ

на атрыманне вучонай ступені кандыдата навук в. аб. дацэнта ЛАПО А. І.

Тэма: «Аб асноўных агратэхнічных фактарах ільнянога насеннаводства».

Апаненты: доктар с. г. навук праф. Дарожкін Н. А., праф. Лупінові І.С.

МЕНСКІ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. М. ГОРКАГА

абвяшчае ПРЫЁМ на 1937-1938 навучальны год

на наступныя факультэты: гістарычны, геаграфічны, літаратуры і мовы, дашкольны, замежных моў—нямецкае, англійскае і французскае аддзяленні, на яўрэйскую і польскую секцыі літаратурнага і гістарычнага факультэтаў.

Інстытут рыхтуе выкладчыкаў для сярэдняй школы, тэхнікумаў і рабфакаў.

У інстытут прымаюцца асобы ва ўзросце ад 17 да 35 год з закончанай сярэдняй адукацыяй (дзесяцігодка, тэхнікум, рабфак) або атрымаўшыя атэстат аб сканчэнні сярэдняй школы ў парадку экстэрната.

Незалежна ад адукацыі паступаючыя падвяргаюцца іспытам у аб'ёме сярэдняй школы па рускай і беларускай мовах (пісьмовы твор, граматыка і літаратура), палітграмаце, матэматыцы, фізіцы, хіміі і па адной з замежных моў (англійскай, нямецкай або французскай—па выбару паступаючага).

Паступаючыя на яўрэйскую і польскую секцыі падвяргаюцца іспытам па яўрэйскай і рускай або польскай і рускай мовах.

УВАГА. Скончыўшыя сярэднюю школу (дзесяцігодку) і маючыя па асноўных прадметах аднакі «выдатна», а па астатніх прадметах адзнаку не ніжэй «добра», прымаюцца ў інстытут без прыёмовых іспытаў. Гэта права распаўсюджваецца і на скончыўшых сярэднюю школу ў парадку экстэрната.

Заявы падаюцца на імя дырэктара МПІ з прадстаўленнем наступных дакументаў: аўтабіяграфіі, атэстата аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы (у арыгінале), пашпарта (прад'яўляецца пры асабістай яўцы), 3-х фатаграфічных картак (здымкі без галаўных убораў), з уласнаручным подпісам паступаючага на кожнай з іх, завераныя дзярж. установай, і даведкі аб адносінах да воінскай павіннасці (для ваеннаабавязаных).

УВАГА. У заяве трэба ўказаць, які факультэт і спецыяльнасць паступаючы выбірае, а таксама падрабязны адрас.

Прыём заяў аб залічэнні праводзіцца з 1 ліпеня па 1 жніўня 1937 года.

Прыёмныя іспыты праводзяцца з 1 па 20 жніўня, а залічэнне ў лік студэнтаў — з 21 па 25 жніўня.

Іншагародніх студэнты забяспечваюцца інтэрнатам. Стыпендыя — у залежнасці ад паспяховасці.

Членам сям'і студэнтаў інтэрнат не прадастаўляецца.

Заявы падаваць па адрасу: г. Менск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, канцылярыя МПІ, пакой 2-30.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Уп. Галаўлітбела № К—2098. Друкарня газеты «Звязды». Менск, Совецкая, 63. К., К., С.